4-павярховы… катэдж? І такое бывае...

СТАР. 2

Нематэрыяльная спадчына. Што яе ўратуе?

СТАР. 3

Быць дзікуном можна і ў… Іспаніі.

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

15 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. АЎТОРАК № 194 (27559) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ПАКІНУЦЬ ДОБРЫЯ ЎРАЖАННІ АБ НАШАЙ СТАЛІЦЫ»

Для Беларусі развіццё еўразійскай інтэграцыі з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў у дзяржаўнай знешняй палітыцы. Аб гэтым заявіў 14 кастрычніка Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення саміту кіраўнікоў дзяржаў СНД, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Прэзідэнт адзначыў, што на гэтай нарадзе на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў трэба абмеркаваць гатоўнасць да правядзення важнейшых інтэграцыйных мерапрыемстваў, якія адбудуцца ў Мінску 24-25 кастрычніка. У прыватнасці, у беларускай сталіцы пройдуць пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета і Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Акрамя таго, на палях саміту СНД украінская дэлегацыя на чале з Прэзідэнтам і прэм'-ер-міністрам правядзе кансультацыі з адпаведнымі прадстаўнікамі самага высокага ўзроўню Адзінай эканамічнай прасторы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што галоўным пытаннем маючага адбыцца пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета стане работа над Дагаворам аб Еўразійскім эканамічным саюзе з пералікам абмежаванняў і выключэнняў з рэжыму свабоднага гандлю.

Прэзідэнт нагадаў, што ў гэтым годзе Беларусь старшынствуе ў СНД. Раней усе знакавыя рашэнні Садружнасці прымаліся ў Мінску, да таго ж у беларускай сталіцы размешчана штаб-кватэра СНД. Беларусь вылучыла і рэалізуе шэраг канструктыўных ініцыятыў. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, правядзенне пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД з'яўляецца ключавым момантам беларускага старшынства, і беларускі бок надае гэтай падзеі асаблівае значэнне. Прэзідэнт падкрэсліў, што ўсе кіраўнікі дзяржаў СНД пацвердзілі ўдзел у мінскім саміце.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што праграма правядзення мерапрыемстваў сфарміравана, і папрасіў яе аператыўна накіраваць пасля зацвярджэння калегам у краіны Садружнасці, а таксама ў Выканаўчы камітэт СНД.

Месцам правядзення саміту стане Палац Незалежнасці. Паводле слоў Прэзідэнта, гэты выбар абумоўлены магчымасцю забяспечыць максімальна зручныя і камфортныя ўмовы для работы гасцям саміту. Цяпер на будаўнічай пляцоўцы Палаца Незалежнасці ідзе завяршальны этап. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў далажыць, якая сітуацыя на гэтым аб'екце. «Усё трэба зрабіць для таго, каб нашы госці адчувалі сябе камфортна», — сказаў ён.

Міністр замежных спраў Уладзімір Макей паведаміў аб узгадненні парадку дня маючых адбыцца інтэграцыйных мерапрыемстваў і фарміраванні пазіцыі Беларусі па плануемых для разгляду пытаннях. Іншыя ўдзельнікі нарады далажылі аб розных аспектах гатоўнасці сталіцы да маючых адбыцца мерапрыемстваў.

МЫ МАЕМ УСЕ ШАНЦЫ СПЫНІЦЬ СКАРАЧЭННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА

Такое меркаванне выказаў учора намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль Тозік на ўрачыстым прыёме жанчын у Савеце Міністраў, прысвечаным Дню маці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Нацыянальнай праграмай дэмаграфічнай бяспекі Беларусі на 2011—2015 гады пастаўлена найважнейшая задача — да 2015 года спыніць змяншэнне колькасці беларускага насельніцтва. «Для тэрыторыі нашай краіны нас і так нямнога, мы да гэтага часу не перасягнулі даваенную колькасць беларускага народа. Аднак у чэрвені гэтага года спынілася змяншэнне насельніцтва. За студзень—жнівень натуральнае змяншэнне склала 6 тыс. чалавек, але яго перакрыў натуральны міграцыйны прырост, інакш кажучы, у краіну прыехала людзей больш, чым выехала, гэта вельмі важна, таму што ў нестабільную краіну, у якой людзі не могуць спрагназаваць сваю будучыню і будучыню сваіх дзяцей, ехаць не будуць», — адзначыў Анатоль Тозік. Паводле яго даных, у студзені—жніўні гэтага года ў краіну прыбылі 11 639 чалавек, а выбылі — 4 808 чалавек.

На думку намесніка кіраўніка беларускага ўрада, калі гэта дадатная дынаміка захаваецца ў краіне, то пастаўленая праграмай задача будзе выканана нават датэрмінова, гэта значыць раней за 2015 год». Калі б мы яшчэ маглі захаваць людзей, якія ідуць з жыцця з-за ненатуральных прычын, то і міграцыйны прырост нам быў бы не такі істотны.

Анатоль Тозік адзначыў і добрую нараджальнасць. «Гэта сведчыць аб добрай атмасферы ў краіне ў гэтай галіне і стабільнасці, бо людзі нараджаюць дзяцей, калі яны ўпэўнены ў іх будучыні. Лічу, што мы здолелі для гэтага стварыць неабходную маральную і сацыяльна-эканамічную абстаноўку. Адыграла сваю ролю і сістэма падтрымак, значнае павелічэнне дапамог па доглядзе дзіцяці да трох гадоў», — адзначыў ён. Пры гэтым, на думку віцэ-прэм'ера, трэба стымуляваць сем'і да нараджэння другога дзіцяці, бо сёння ў Беларусі 66 працэнтаў сем'яў маюць па адным дзіцяці, а калі сем'і будуць імкнуцца да нараджэння трэцяга дзіцяці, то нацыя пачне прырастаць.

НЕЧАКАНАЕ ЗНАЁМСТВА

Маладыя мамы любяць адпачываць з дзецьмі на возеры ў Глыбокім.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СХІЛЯЕМСЯ ПЕРАД КОЖНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МАЦІ

Віншаванне Прэзідэнта Беларусі з Днём маці

Дарагія жанчыны!
Сардэчна віншую вас з Днём маці.

Мама — першае і самае цудоўнае слова, якое вымаўляе дзіця. На ўсіх мовах свету яно гучыць практычна аднолькава, трапятліва і пяшчотна, прымушаючы пранікнуцца глыбокай павагай да той жанчыны, якая дорыць жыццё. З бацькоўскага клопату пачынаецца дзіцячае шчасце, а калі мы становімся больш дарослымі, вернае мацярынскае сэрца і моцнае плячо бацькі служаць апорай у любых сітуацыях.

Мы стараемся зрабіць усё для таго, каб на нашай зямлі не засталося ніводнага малога, які не ведае дамашняй цеплыні. І таму, схіляючыся перад кожнай беларускай маці, словы асаблівага прызнання адрасуем сёння тым, хто ўзяў пад сваё крыло юных сірот, стаўшы для іх сапраўды родным чалавекам.

Пастаянная падтрымка мацярынства і дзяцінства, умацаванне ў грамадстве статусу традыцыйных каштоўнасцяў шлюбу, аўтарытэту маці і бацькі, фарміраванне ў моладзі паважлівага стаўлення да жанчыны — прадаўжальніцы роду, захавальніцы сямейных асноў і маралі з'яўляюцца прыярытэтнымі напрамкамі нашай ідэалогіі і сацыяльнай палітыкі.

Мілыя мамы! Няхай у вашых дамах пануюць лад, згода, дастатак і ўтульнасць, няхай дзеці і ўсе блізкія людзі апраўдваюць надзеі і нязменна радуюць сваёй любоўю.

Добрага вам здароўя, поспехаў, шчасця і сямейнага дабрабыту.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЭКАНАМІЧНАЯ РЭФАРМАЦЫЯ

Як мы ўжо паведамлялі, днямі быў падпісаны план сумесных дзеянняў Савета Міністраў і Нацыянальнага банка па структурным рэфармаванні і павышэнні канкурэнтаздольнасці эканомікі Беларусі. Цяпер адказныя галіновыя ведамствы патлумачылі сэнс і прынцыпы рэалізацыі згаданага дакумента, распавялі пра некаторыя пункты плана.

Засталося аддаць $ 800 мільёнаў дзярждоўгу

І Міністэрства фінансаў ведае, дзе ўзяць гэтыя грошы. «Да канца года нам трэба будзе яшчэ выплаціць больш за 800 млн доларaў для пагашэння дзяржаўнага доўгу, і гэтыя абавязацельствы мы плануем рэфінансаваць шляхам атрымання траншу на 440 млн. доларaў крэдыту Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС і дадатковага размяшчэння валютных аблігацый Мінфіна на ўнутраным рынку», — паведаміў **намеснік міністра фінансаў Максім ЕРМАЛОВІЧ**. Па яго словах, такая праца ідзе сістэмна, ёсць планы на гэты і наступны год, таму што з улікам прэферэнцыяльных рэжымаў, якія ўвёў Нацыянальны банк, з улікам дзейнай эфектыўнай стаўкі па гэтых каштоўных паперах прывабнасць валютных аблігацый Мінфіна захоўваецца як для юрыдычных, так і для фізічных асоб. Акрамя таго, чакаецца, што неўзабаве будзе прынята пастанова Нацбанка, якая яшчэ больш павысіць прывабнасць валютных дзяржаблігацый. «Сёння попыт стабільны, на ўзроўні прыкладна 100 млн доларaў у месяц. У прынцыпе, да канца года 200-270 млн, думаю, мы ад юрыдычных асоб прыцягнем», — сказаў Максім Ермаловіч. А ўсяго такім спосабам будзе прыцягнута каля 500 млн доларaў.

Выдаткі бюджэту жорстка абмяжуюць

«Распрацоўка плана была абумоўлена тым, што практычна з пачатку бягучага года паступова, але досыць пагрозліва нарасталі дысбалансы, якія неабходна было ліквідаваць, дзейнічаючы аператыўна, — кажа Максім Ермаловіч. — Мы пачалі губляць даходы бюджэту з пачатку 2013 года і па падатку на прыбытак, і па ўвазных мытных пошлінах. Звязана гэта было з тым, што змяніліся вонкавыя ўмовы даходаў нашых прадпрыемстваў, што істотна і паўплывала на стан рахунку бягучых аперацый, у выніку пацярпеў і бюджэт, і ўзнік пэўны ціск на золатавалютныя рэзервы. Адмоўна на стан бюджэту і прыбыткі таксама паўплывала сітуацыя на калійным рынку». Наконт бягучага стану бюджэту прадстаўнік Мінфіна сказаў, што «сёлета мы абмяжоўваем дэфіцыт бюджэту сектара дзяржкіравання лічбай не больш за 0,8% ВУП. Гэта досыць жорсткі параметр для бягучага года, таму што страты бюджэту ацэньваюцца каля 17 трлн рублёў». Каб бюджэт быў збалансаваны з такім мінімальным дэфіцытам, які дзяржава здольна прафінансаваць, неабходна абмежаваць выдаткі да канца года. Што і будзе зроблена.

Новая праграма ўзаемадзеяння з МВФ

«У плане ёсць пункт, які прадугледжвае кансультацыі з Міжнародным валютным фондам аб магчымасці фінансавання ў межах новай праграмы ўзаемадзеяння», — адзначыў **Тарас НАДОЛЬНЫ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка**. Дарэчы, чарговы візіт місіі Міжнароднага валютнага фонду ў Беларусь запланаваны на перыяд з 17 па 28 кастрычніка.

Прадстаўнік галоўнага банка краіны таксама звярнуў увагу на сітуацыю з плацежным балансам: «На наш погляд, праблему збалансаванасці плацежнага балансу краіны за кошт паслаблення курса беларускага рубля ў сярэднетэрміновай перспектыве вырашыць немагчыма. Папярэднія карэкціроўкі абменнага курсу далі кароткатэрміновы станоўчы эфект для знешняга гандлю, а ў далейшым гэта было нівеліравана за кошт істотнага росту інфляцыі, прычым тэмпамі больш высокімі, чым у нашых гандлёвых партнёраў. Акрамя таго, паслабленне нацыянальнай валюты вядзе да зніжэння ўзроўню жыцця насельніцтва. Таму праблемы макраэканамічнай збалансаванасці трэба вырашаць за кошт абмежавання росту ўнутранага попыту, які выклікае значны рост імпарту, што падтрымліваецца высокімі рэальнымі грашовымі даходамі насельніцтва пры прадукцыйнасці працы, якая недастаткова павялічваецца».

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ЧОРНЫ, першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама:

«Абарона мацярынства і дзяцінства ў Беларусі заўсёды надавалася прыярытэтная ўвага. Гэтыя пытанні на асаблівым кантролі і ў Магілёўскім аблвыканкаме. Яскравы прыклад таму — будаўніцтва ў вобласці жылля для шматдзетных сем'яў. Калі ў мінулым годзе мы ўвялі ў строй 338 кватэр для шматдзетных сем'яў, то сёлета навасэлле справяць ужо 720 сем'яў. Яшчэ больш сур'ёзныя задачы мы ставім на 2014 год — забяспечыць жыллём усе шматдзетныя сем'і, які маюць у гэтым патрэбу».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.10.2013 г.

Долар ЗША	9150,00	■
Еўра	12410,00	▲
Рас. руб.	283,50	▼
Укр. грыўня	1117,90	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 16°
Віцебск	+ 12°
Гомель	+ 14°
Гродна	+ 15°
Магілёў	+ 12°
Мінск	+ 12°

■ Падземная будоўля

ДА «МАЛІНАЎКІ» — 70 МЕТРАЎ!

Менавіта такую працягласць правага тунэля на вышэйзгаданай станцыі метро засталося ўзвесці будаўнікам. Левы тунэль пакуль недабудаваны на 260 метраў.

— З правага тунэля выйдзем да 10 лістапада. А да канца гэтага тыдня павінны скончыць праходжанне вадзяных грунтаў левага, што дазволіць павялічыць хуткасць праходжання да 3-4 метраў за змену, — паведаміў начальнік дырэкцыі па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна Павел Царун.

Таксама ён адзначыў, што на ўзвядзенні станцыі метро «Малінаўка» ўжо асвоена каля 430 мільярдаў рублёў. Гаворачы пра падрыхтоўку да будаўніцтва трэцяй лініі метро, Павел Царун расказаў, што дзеля яе стварэння пад знос перададзены чатыры будынкі, адзін з якіх шматпавярховы (былая санэпідэмстанцыя).

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПРЫЧЫНАЙ СМЕРЦІ ЯСІРА АРАФАТА СТАЛА АТРУЧЭННЕ?

Расследаванне міжнароднымі экспертамі прычын смерці былога палесцінскага лідара Ясіра Арафата завершана. Як паведамляе са спасылкай на неназваныя крыніцы газета «Коммерсантъ», спецыялісты пацвердзілі, што ён памёр у выніку атручэння палоніем.

Паводле звестак выдання, вынікі экспертызы былі перададзены ўдаве палесцінскага лідара. Суха Арафат павінна будзе вырашыць, што рабіць з гэтымі звесткамі і ці падлягаюць яны афіцыйнай публікацыі. Апошняя экспертыза смерці Арафата праводзілася французскімі, швейцарскімі і расійскімі спецыялістамі. Падчас яе вывучаліся біялагічныя матэрыялы, атрыманыя пры эксгумацыі цела палесцінскага лідара, праведзенай у лістападзе 2012 года.

Былы кіраўнік Палесцінскай нацыянальнай адміністрацыі Ясір Арафат памёр у 2004 годзе ў Парыжы. Яму было 75 гадоў.

ВА УКРАІНЕ АБВЕШЧАНЫ АПОШНІ ПРЫЗЫЎ

Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч падпісаў указ аб апошнім прызыве і пераходзе на фарміраванне Узброеных Сіл па кантрактным прынцыпе. «Я сёння раніцай падпісаў указ... Там усё распісана, як будуць звальняцца ў запас салдаты тэрміновай службы і пойдуць сёлета апошнія, і больш не будзем прызываць», — сказаў ён, адзначыўшы, што набор на тэрміновую службу захаваецца толькі ва ўнутраных войсках. Прэзідэнт Украіны падкрэсліў , што сёння ўзбраенне ўкраінскай арміі, тэхналогіі, якія прымяняюцца ў рабоце, дасягнулі таго ўзроўню, калі неабходна прыцягненне лепшых з лепшых спецыялістаў. «Тэхніка вельмі складаная, таму армія цяпер павінна быць прафесійнай», — сказаў Януковіч.

НОБЕЛЕЎСКАЯ ПРЭМІЯ ПА ЭКАНОМІЦЫ ПРЫСУДЖАНА ВУЧОНЫМ З ЗША

Нобелеўскі камітэт па эканоміцы пры Каралеўскай акадэміі навук у панядзелак абвясціў імя лаўрэата прэміі Дзяржаўнага банка Швецыі памяці Альфрэда Нобеля за 2013 год. З прамой трансляцыі на сайце камітэта стала вядома, што прэстыжную ўзнагароду атрымалі Юджын Фама, Пітэр Хэнсан, Роберт Шылер. Журы адзначыла іх працы па тэме «эмпірычны аналіз цэн на актывы».

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ШАМПІНЬЁНЫ ДАПАМАГАЮЦЬ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ РАКУ?

У шампіньёнах знайшлі рэчыва, якое дапамагае супрацьстаяць анкалагічным захворванням.

Навукоўцы з амерыканскага Універсітэта Тафтса правялі даследаванне, у ходзе якога выявілі ў грыбах прадукт, які ўмацоўвае імунную сістэму. Аказалася, што звычайныя шампіньёны дапамагаюць арганізму чалавека супрацьстаяць магчымым анкалагічным захворванням, паколькі ў саставе гэтых грыбоў ёсць адмысловыя рэчывы, якія аказваюць станоўчае ўздзеянне на «змагароў з ракам» — дэндрытныя клеткі. Дэндрытныя клеткі стымулююць вытворчасць белых крывяных цельцаў — Т-лімфацытаў. Дзякуючы іх наяўнасці ракавыя клеткі не здольныя пераадольваць імунную абарону арганізма. Эксперты з Каліфорніі выявілі, што ў жанчын з дыягнаставаным ракам грудзей, якія з'ядалі па 100 грамаў шампіньёнаў за дзень, было адзначана памяншэнне росту пухліны.

КАРАТКА

Стартаваў другі этап продажу білетаў на чэмпіянат свету па хакеі 2014 года. У продаж паступілі абанементы, якія даюць магчымасць наведаць усе матчы групавога раўнда на кожнай з арэн; усю фінальную стадыю гульняў на «Мінск-Арэне»; усе матчы зборнай Беларусі ў час папярэдняга этапу. Цэнавы дыяпазон на «Мінск-Арэне» — ад Br1 млн 960 тыс. да Br13 млн 580 тыс., на «Чыжоўцы-Арэне» — ад Br1 млн 680 тыс. да Br11 млн 760 тыс.

Следчы камітэт Расіі распачаў крымінальную справу ў дачыненні да генеральнага дырэктара «Уралкалія» Уладзіслава Баўмгертнера па артыкуле «Злоўжыванне паўнамоцтвамі».

З 15 кастрычніка па 15 ліпеня будзе дзейнічаць забарона на здабычу вузкапалага рака.

Амаль кілаграм асабліва небяспечнага наркотыку выявілі мінскія мытнікі ў пасылцы, якая была адпраўлена з Кітая.

ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА ПРАДКАЗАННЯ БУДУЧЫНІ І ВАРАЖБЫ?

Вольга АЛІМАВА, фатограф:

— Да варажбы ў мяне супярэчлівае стаўленне. Некаторыя дагэтуль займаюцца ёю, напрыклад, у ноч на Каляды ці на Купалле. Пытанне: навошта варажыць, калі ты можаш звярнуцца да Бога? Такім чынам паганскія абрады, карані якіх у нашай гісторыі, разам з хрысціянствам ствараюць кантрасную карціну. А што да прадказання будучыні, то я думаю, што гэта ў пэўнай ступені прыніжэнне магчымасцяў чалавека ўплываць на свой лёс. Можа, гэта толькі ілюзія ўладарання ўласным жыццём, але для мяне важны не столькі вынік, колькі сам працэс пазнання, стварэння і развіцця.

Марына ЦЕРАХАВА, дзіцячы практык-псіхолаг:

— У прадказанні я веру, але, напрыклад, астролагам не давяраю, лічу гэта спосабам зарабляць грошы. А супастаўляючы прадказанні той жа Вангі з рэчаіснасцю, веру, што ёсць нейкія вышэйшыя сілы, а таксама адзінкі сярод людзей, якія могуць прадбачыць. У маладосці я сутыкнулася з варажбой. Мне прадказалі дваіх дзяцей, хлопчыкаў, з розніцай у сем гадоў. У маіх дзяцей насамрэч такая розніца ва ўзросце, праўда, гэта хлопчык і дзяўчынка. А вось маёй сяброўцы наваражылі неўзабаве вялікае гора і позняе замужжа, і праўда: хутка ў яе памерла маці, а замуж яна выйшла ў 32. Але выпадкі, калі варажба збываецца, рэдкасць.

Наталля ВОЛКАВА, бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:

— Усур'ёз ніколі не цікавілася варажбой ці прадказаннем будучыні. Адзінае што, неяк у падлеткавым узросце варажылі з сяброўкамі на нарачонага ў ноч на Вадохрышча (да таго ж, гэтая ноч выпала на пятніцу 13-га — ідэальнае спалучэнне для містыкі). Цяпер я замужам і магу сказаць, што з той варажбы нічога не спраўдзілася, а сам факт гэткай падлеткавай забавы ўзгадваецца з усмешкай. Увогуле, у жаданні чалавека спасцігнуць таямніцы будучыні няма нічога дзіўнага: бадай што ўсім нам уласцівыя цікаўнасць і страх перад невядомым. У той жа час спробы прадказаць будучыню заўсёды менш канструктыўныя, чым намаганні ствараць гэтую будучыню самастойна.

Падрыхтавала Дзіяна СЕРАДЗЮК.

■ Наўздагон

ДЭМАГРАФІЧНАЯ БЯСПЕКА ЯК УМОВА СУВЕРЭНІТЭТУ

Пра якія стратэгічныя напрамкі развіцця краіны казалі і не казалі на прэс-канферэнцыі Аляксандра Лукашэнкі для прадстаўнікоў расійскіх рэгіянальных СМІ

Ёсць штосьці цікавае ў тым, што Беларусь да гэтага часу не мае стратэгіі павелічэння колькасці насельніцтва ў два разы. Нягледзячы на тое, што і год, і два, і больш таму Аляксандр Лукашэнка называў гэтую задачу сярод дзяржаўных прыярытэтаў. У ходзе ж прэс-канферэнцыі для прадстаўнікоў расійскіх сродкаў масавай інфармацыі яе рашэнне было названа ўжо неабходнай умовай захавання суверэнітэту краіны.

«Самая вялікая праблема ў нас нават не грошы (хоць з імі заўсёды ёсць праблемы ў гэтай блытаніне, гэтай рынкавай эканоміцы), а людзі. На нашу тэрыторыю не хапае як мінімум столькі чалавек, колькі ў нас жыве: нам трэба не 10 мільёнаў чалавек, а 20. Мы зможам іх лёгка пракарміць. Але і яны будуць працаваць і яшчэ большы аб'ём прадукцыі стварацьі», — заявіў Прэзідэнт. І далей, разважаючы ўжо аб праекце «Вялікая сям'я», Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Трое дзяцей у сям'і павінна быць нормай. Толькі тады мы будзем мець перспектыву развівацца як нармальная суверэнная і незалежная дзяржава. Кошт пытання вялікі: можа, і 1 мільярд, а можа, і 2. Але і мэта вялікая. Без людскога рэсурсу ніякай дзяржавы не будзе».

Дарэчы, сам аповед кіраўніка дзяржавы аб праекце «Вялікая сям'я» вельмі паказальны. У ім ён згадаў пра нейкага «банкіра», які фактычна «на грамадскіх пачатках» распрацоўваў прапановы па вырашэнні дэмаграфічнай праблемы ў Беларусі з улікам лепшага сусветнага вопыту. Калі кіраўніцтва звярнулася да неспецыялістаў у пошуку эфектыўных рашэнняў, значыць, ёсць надзея на тое, што пытанне не спусціць «на тармазах».

Беларусь мае бліскучы вопыт дзяржаўнай падтрымкі мацярынства і дзяцінства класічным інструментарыем дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. Дапамогі, ільготы, сацыяльная абарона сям'і — усё гэта на высокім узроўні, улічваючы абмежаваныя фінансавыя рэсурсы, рэалізавана ў рамках Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі. Аднак гэты класічны інструментарый мае свае абмежаванні. Гэта і распальванне ўтрыманскіх безадказных настрояў, і многае іншае. Самае галоўнае — падтрымка можа дапамагчы сям'і не апусціцца на дно, але пазітыўных стымулаў для стварэння шматдзетнай сям'і яна не стварае. І праўда, не будзе ж чалавек «рабіць» дзяцей з разлікам купіць дом на льготны крэдыт.

Стварэнне трохдзетнай сям'і — гэта, па вялікім рахунку, пытанне ладу жыцця і асабістых жыццёвых прыярытэтаў, жаданне ўкараняцца на сваёй зямлі і гатоўнасць думаць пра жыццё на некалькі пакаленняў наперад. Менавіта таму тыя захады, пра якія казаў Прэзідэнт на прэс-канферэнцыі (налічэнне на персанальны ашчадны рахунак дзіцяці значнай сумы «мэтавых» грошай), можна аднесці да сацыяльнай палітыкі новага тыпу. Яна звязана са стварэннем персанальных траекторый жыццёвага росту для кожнага новага грамадзяніна краіны і дазваляе кожнаму з бацькоў з упэўненасцю глядзець на будучыню свайго дзіцяці і сваёй сям'і.

Дарэчы, гэтая здольнасць жыць будучыняй, бачыць на некалькі пакаленняў наперад непарыўна звязана са здольнасцю народа будаваць і ўзнаўляць сваю дзяржаўнасць. Як сказаў Аляксандр Лукашэнка, Беларусь да яго прэзідэнства характарызавалася тым, што «не было дзяржавы. Людзі нават не думалі, псіхалагічна, ментальна мы да гэтага не былі падрыхтаваны». Таму змена дэмаграфічнай палітыкі, якую прапануе сёння Прэзідэнт, наўпрост звязана і са змяненнем грамадскай свядомасці, якое павінна быць здзейснена — з пераходам да ўсведамлення беларусамі свайго гістарычнага лёсу як суверэннай дзяржавы.

Сур'ёзнасць намераў кіраўніка дзяржавы ў вырашэнні дэмаграфічнай праблемы была пацверджана і яго пазіцыяй па пытанні аб працоўнай міграцыі, у тым ліку з Цэнтральнай Азіі. Разумеючы ўсю насцярожанасць у дачыненні да гэтага працэсу (з улікам негатыўнага расійскага досведу), Прэзідэнт, тым не менш, адзначыў, што ён з'яўляецца выгадным для Беларусі пры ўмове наяўнасці сістэмы і парадку пры прыёме імігрантаў. Важна разумець, што такая пазіцыя ні ў якім разе не разглядаецца як альтэрнатыва захадам па стымуляванні нараджальнасці і сацыяльным развіцці ў цэлым карэннага насельніцтва. Важнасць міграцыйных працэсаў вызначаецца тым, што яны дазваляюць запаўняць уразлівыя нішы на рынку працы прама цяпер, не чакаючы нараджэння і сталення новых грамадзян. А сістэмны падыход і строгі кантроль у гэтай сферы павінны прадухіліць адпаведныя злоўжыванні (напрыклад, па расійскім сцэнарыі). Адначасова паглыбленне супрацоўніцтва ў гэтым кірунку з працавітымі народамі Цэнтральнай Азіі з'яўляецца выдатным спосабам узмацнення сваёй прысутнасці ў гэтым стратэгічна важным для сучаснага свету рэгіёне.

Аднак яшчэ адно стратэгічнае пытанне ўсё ж такі не было разгледжана на прэс-канферэнцыі кіраўніка дзяржавы. Для дэмаграфічнага развіцця разам са стымуляваннем росту нараджальнасці і зніжэннем смяротнасці, правільным эканамічным выкарыстаннем міграцыі неабходны эфектыўныя захады па арганізацыі рэгіянальнага развіцця. І як не ўзгадаць у сувязі з гэтым шматразовае патрабаванне Аляксандра Лукашэнкі аб спыненні росту горада Мінска і фарсіраваным развіцці рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадоў. На жаль, па гэтым пытанні на прэс-канферэнцыі нічога не было сказана. Але ёсць падставы спадзявацца, што і ў гэтым кірунку пэўная праца ўсё ж такі ідзе.

Юрый ЦАРЫК, кіраўнік Беларускай групы развіцця.

ЭКАНАМІЧНАЯ РЭФАРМАЦЫЯ

Усе дзяржпраграмы будуць фінансавацца праз Банк развіцця

Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ, першы намеснік кіраўніка апарату Савета Міністраў Беларусі — кіраўнік сакратарыята прэм'ер-міністра, расказаў пра сутнасць новых падыходаў да макраэканамічнай палітыкі: «Унутраны попыт у эканоміцы ў нас будзе строга адпавядаць рэсурсам і магчымасцям нашай эканомікі. А значыць, у кароткатэрміновым перыядзе будзе забяспечана гнуткасць і прадказальнасць эканамічнай палітыкі, рэалізаваны канкрэтныя рашэнні ў сферы бюджэту, крэдытавання эканомікі, эканамічнай і падатковай палітыцы, прыватызацыі. Для гэтага планам прадугледжаны цэлы блок захадаў. На неэмісійнай аснове будзе ліквідавана адхіленне ад разліковых паказчыкаў у бюджэтнай палітыцы. Знешнія фактары тут аказалі негатыўнае ўздзеянне як на даходную, так і на расходную частку бюджэту, таму пасля аптымізацыі дзяржаўнага бюджэту будуць цалкам прафінансаваны ўсе сацыяльныя і абароненыя выдаткі, уключаючы зарплаты бюджэтнікаў, абавязацельствы па знешнім і ўнутраным дзяржаўным доўгу і іншыя. Будзе забяспечана ўмераная жорсткасць грашова-крэдытнай палітыкі — лішніх рублёў, якія маглі б націскаць на валютны рынак, проста не будзе. Па нашых разліках, да канца года прырост крэдытаў у эканоміцы не перавысіць 9 трлн рублёў (каля 1% росту крэдытавання за месяц). Выразна будуць збалансаваны крыніцы па праграмах будаўніцтва і аграпрамысловага комплексу. Без зніжэння золатавалютных рэзерваў прадугледжваецца забеспячэнне выплаты знешняга дзярждоўгу і збалансаванасць усіх валютных абавязацельстваў урада і Нацыянальнага банка. Павышаецца эфектыўнасць выкарыстання дзяржаўнай маёмасці. Будзе ўдасканальвацца сістэма кіравання эканомікай і сацыяльна-эканамічнага планавання. Асноўнымі прыярытэтамі будуць паказчыкі эфектыўнасці, прыбытковасці, сальда знешнеэканамічнай дзейнасці».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах Аляксандра Забароўскага, да пачатку 2014 года будзе зацверджаны фінансавы план, дзе па ўсіх дзяржаўных праграмах і мерапрыемствах звязваюцца крэдытныя, асабістыя і бюджэтныя сродкі і напрамкі іх выкарыстання. «Будзе ўведзена такое паняцце, як дзяржаўная праграма крэдытавання, каб жорстка ацэньваць эфектыўнасць дзяржаўнага крэдытнага партфеля. Усе дзяржаўныя праграмы з 2014 года будуць фінансавацца праз Банк развіцця, і ніякіх бюджэтных аперацый праз іншыя банкі не будзе», — падкрэсліў ён і сказаў, што план — гэта галоўны аператыўны дакумент, у адпаведнасці з якім будуць прымацца кіраўнічыя рашэнні, рыхтавацца дакументы па прагнозе 2014 года.

Для рэформаў ужо гатовы законы

Дарэчы, план ужо быў прадстаўлены Міжнароднаму валютнаму фонду падчас візіту дэлегацыі высокага ўзроўню ў межах удзелу ў штогадовым пасяджэнні саветаў кіраўнікоў Сусветнага банка і МВФ, якое прайшло 11-13 кастрычніка. **Дзмітрый ГОЛУХАЎ, намеснік міністра эканомікі,** заявіў, што план сумесных дзеянняў урада і Нацбанка ахоплівае некалькі гарызонтаў і прадугледжвае захады на кароткатэрміновую, сярэднетэрміновую і доўгатэрміновую перспектывы. Для правядзення рэформаў, па словах намесніка міністра, ужо падрыхтаваны да выпуску шэраг заканадаўчых актаў: «Да канца года мы гатовы прадставіць заканадаўцам праект закона аб дзяржаўным індыкатыўным планаванні, дзяржаўна-прыватным партнёрстве, а таксама аб антыманапольным рэгуляванні». У цэлым, паводле яго слоў, рэформы накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці размеркавання рэсурсаў, вызваленне іх для росту беларускай эканомікі, павышэнне доступу да іх (перш за ўсё новым галінам, малому і сярэдняму бізнесу). Вялікім блокам сумеснага дакумента з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнага сектара.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

НАВІНЫ

Фота БЕЛТА.

Хакейная каманда Прэзідэнта Беларусі выйграла ў дружыны Сейма Латвіі — 6:5 (4:1, 2:3, 0:1) у таварыскім матчы, які прайшоў у Мінску на лядовай пляцоўцы клуба «Юнацтва» ў парку імя Горкага.

ПОЛАЧЧЫНА — ЛЕПШАЯ Ў НАМІНАЦЫІ «ТУРЫЗМ»

Полацкі раён прызнаны лепшым у намінацыі «турызм» па выніках міжнароднага конкурсу на лепшы праект трансгранічнага супрацоўніцтва. Конкурс быў праведзены ў рамках Кангрэса ініцыятыў Усходняй Еўропы. Яго асноўная мэта — развіццё трансгранічнага супрацоўніцтва, абмен вопытам і мадэлямі эфектыўнай практыкі ў галіне праектных ініцыятыў, якія рэалізуюцца на тэрыторыі Усходняй Еўропы.

Афіцыйная цырымонія ўзнагароджання адбылася нядаўна ў польскім горадзе Люблін. Ва ўрачыстых абставінах былі абвешчаны пераможцы ў сямі намінацыях. Полацкі раён прызналі пераможцам у турыстычнай намінацыі з сямі прэтэндэнтаў з розных краін. Лепшым быў прызнаны праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Бэла Дзвіна — падарожнічаючы праз межы, адкрываючы культуру, атрымліваючы асалоду ад прыроды рэгіёна Заходняй Дзвіны/Даўгавы».

Зараз у Полацкім раёне і ва ўсёй Віцебскай вобласці рэалізуецца праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Узмацненне магчымасцяў турыстычнага развіцця ў памежным рэгіёне Латгале — Уцена — Віцебск» (праект «Бэла Дзвіна 2». — **Аўт.**). Як паведамілі ў Полацкім раённым выканаўчым камітэце, да канца месяца ў рамках праекта будзе праведзена ўладкаванне месца адпачынку, установяць турысцка-інфармацыйныя шчыты, больш як трыццаць указальнікаў для турыстаў і інфармацыйных таблічак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КІРМАШ — РЭАЛЬНЫ ШАНЦ ЗНАЙСЦІ ПРАЦУ

24 кастрычніка з 10 да 13 гадзін у мінскім Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў (вул. Чкалава, 7) пройдзе агульнагарадскі кірмаш вакансій.

Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама запрашае ўсіх ахвотных. У мерапрыемстве абяцаюць узяць удзел больш за 100 наймальнікаў розных сфер дзейнасці, якія заявілі аб патрэбах у работніках. Праехаць да Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў можна аўтобусамі №№ 10, 40, 45, 47, 53, 73, 100, тралейбусамі №№ 19, 27, 43, 51, 59 да прыпынку «Гасцініца «Спадарожнік».

Сяргей СТАРЫНАЎ.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ

ЦАНА МІРНАГА ЖЫЦЦЯ

У аграгарадку Лясная Слаўгарадскага раёна адзначылі юбілей гістарычнай даты — 305-годдзя вялікай бітвы рускіх і шведскіх войскаў.

Падчас Паўночнай вайны каля Лясной сышліся ваяры цара Пятра I і караля Карла. У бітве загінулі тысячы людзей. Расія атрымалі перамогу, і ў гонар яе на пачатку XX стагоддзя ў вёсцы паставілі помнік з арлом над зрынутым варожым сцягам і ўзвялі прыгожы праваслаўны храм, які і цяпер упрыгожвае цэнтральную плошчу аграгарадка.

Памяць пра бітву ў Лясной захоўваюць і сёння. З нагоды юбілею ў Свята-Пятра-Паўлаўскім храме прайшла святочная літургія, праваслаўныя вернікі прайшлі хрэсным ходам да помніка, дзе маліліся за ахвяр Паўночнай вайны і ўсіх іншых і ўсклалі кветкі.

— Галоўны ўрок гістарычнай падзеі: людзі павінны жыць у міры, — сказала кіраўнік справамі Слаўгарадскага райвыканкама Таццяна Бабічава. — Войны нясуць шмат крыві, болю і слёз, таму мы ганарымся тым, што вось ужо 70 гадоў на нашай зямлі мір, людзі спакойна жывуць і гадуюць сваіх дзяцей.

Юбілеі далёкіх бітваў сапраўды нагадваюць людзям найперш пра каштоўнасці цяперашняга мірнага жыцця.

— Трэба нам працаваць і ўсё рабіць дзеля таго, каб наша зямля была не арэнай жорсткіх баёў, а квітнеючым садам, дзе людзі жывуць мірна, — сказаў Георгій Сакалоў, настаяцель Свята-Пятра-Паўлаўскага храма.

Ілона ІВАНОВА.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі з трагічнай гібеллю члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь САЛАДКОВА Аляксандра Пятровіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

«НАМ ВЕЛЬМІ СПАДАБАЛАСЯ ВАША КРАІНА»

Расійскія журналісты пасля прэс-канферэнцыі з кіраўніком нашай дзяржавы раз'ехаліся па дамах. Мы спыталі некаторых з іх, што ў гутарцы з Прэзідэнтам Беларусі было найбольш актуальным менавіта для іх аўдыторыі.

Леанід ГАРАІНАЎ, першы намеснік галоўнага рэдактара «Парламентской газеты» (Масква):

— Напэўна, для расійскіх газет, і, у прыватнасці для нашай, цікавай была сітуацыя з «Уралкаліем». Прэзідэнт Беларусі добра паказаў нам адваротны бок гэтага канфлікту. Таксама ўсіх вельмі хвалявала магчымае аб'яднанне «КамАЗа» і беларускага «МАЗа». На мой погляд, Аляксандр Лукашэнка вельмі канкрэтна распавёў, чаму такое аб'яднанне не адбылося і якія ўмовы беларускага боку: тэхналогіі, новыя рынкі і інвестыцыі. Асабіста мяне таксама цікавіла адно пытанне, якое я і задаў Прэзідэнту: ці ў поўнай меры Беларусь выкарыстоўвае свой транзітны патэнцыял? Магчыма, прыйшоў час перахапіць частку прыбыткаў у іншых цэнтраў: Вільнюса, Беластока, Любліна? Аляксандр Рыгоравіч пагадзіўся, што сёння сапраўды існуюць добрыя перспектывы ў гэтай сферы і праца ў гэтым кірунку будзе весціся.

Аляксей МІЛАВАНАЎ, галоўны рэдактар інтэрнэт-партала «Новый Калининград» (Калінінград):

— Для нашай аўдыторыі самай цікавай і запамінальнай была, безумоўна, заява пра Калінінградскую вобласць. Пасля кароткага адказу на маё пытанне пра, магчыма, занадта палітызаваную ўвагу расійскіх канталёраў да беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі, беларускі лідар расказаў пра неўзараныя калінінградскія землі і выказаў досыць нечаканую заяву: маўляў, аддайце іх нам, і мы іх будзем араць. Фармулёўкі, якія выкарыстаў кіраўнік беларускай дзяржавы, выклікалі досыць сур'ёзнае абмеркаванне ў Калінінградскай вобласці. Мы разумеем, што мелася на ўвазе, магчыма, стварэнне нейкага сумеснага сельгаспрадпрыемства, але прагучала гэта досыць радыкальна. Акрамя таго, я, калі шчыра, не ўпэўнены, што пры ўсіх відавочных поспехах сельскай гаспадаркі ў Беларусі атрымаецца перанесці беларускі вопыт на нашу зямлю. У нас вельмі шмат сваёй спецыфікі...

Імпануе тое, што Прэзідэнт адказваў сапраўды на ўсе пытанні, што ён трымае руку на пульсе краіны, знаходзіцца ў кантэксце ўсіх працэсаў. Было відаць, што ён дастаткова паглыблены ў эканамічную і сацыяльную спецыфіку краіны.

Канстанцін РАЖКОЎ, карэспандэнт «Пятого канала» (Санкт-Пецярбург):

— Нам вельмі спадабалася ваша краіна, магчымасць паглядзець Гродзенскую вобласць. Спадабалася ўсё: пачынаючы ад першага візуальнага ўражання ад дагледжаных вуліц, тратуараў, прыгожых дамкоў, заканчваючы цэнамі на прадукты харчавання і сяброўскімі адносінамі, з якімі нас сустрэлі.

На прэс-канферэнцыі з кіраўніком дзяржавы было відаць, што ваш прэзідэнт адчувае сябе поўным гаспадаром сітуацыі ў Беларусі. Ён па-майстэрску распараджаецца сваёй роляй, па-заліхвацку падымае з месца сваіх міністраў, прымушае даваць справаздачу. Відаць, што ён верны сабе. І гэта добра.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ ■

■ Адпачынак на любы густ

«ЧАРНОБЫЛЬСКІ» ТУРЫЗМ САСТУПІЎ МЕСЦА ПАЛЯВАННЮ

Сёлета за паўгоддзе Беларусь наведалі 2 555 тысяч замежнікаў, паведаміў дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзім Кармазін, спасылаючыся на статыстыку Дзяржпагранкамітэта. Найбольшая плынь турыстаў (больш за 93% ад агульнага ўезду) — з Украіны, Расіі, Літвы, Польшчы, Малдовы, Латвіі і Германіі.

Па словах Вадзіма Кармазіна, на адпачынак за мяжу сёлета выязджалі 3 060 тысяч нашых грамадзян.

Самымі папулярнымі экскурсійнымі аб'ектамі для замежнікаў у нашай краіне летась сталі Брэсцкая крэпасць, Мір, Нясвіж, палацава-паркавы ансамбль у Гомелі. Усё больш гасцей наведваюць сталіцу. А вось экстрэмальны адпачынак (напрыклад, наведванне забруджаных радыяцыяй тэрыторый) не карыстаецца попытам. «Да «чарнобыльскага» турызму мы ставімся вельмі асцярожна. Былі спробы распрацоўкі такіх маршрутаў, але попыт на іх складаў 16—17 чалавек на год, з іх палова — карэспандэнты», — сказаў Вадзім Кармазін.

62% экспарту турыстычных паслуг у нашай краіне забяспечваюць санаторна-курортныя арганізацыі. На другім месцы — дзелавы турызм (34% паслуг), 2% экспарту прыходзіцца на паляўнічы турызм. Па словах Вадзіма Кармазіна, гэта перспектыўны кірунак для Беларусі: каля 100 тысяч замежнікаў на год прыязджаюць да нас паляваць. У Прыпяцкім нацыянальным парку і Белавежскай пушчы дазволена трафейнае паляванне на зубра. «Ліцэнзія на адстрэл зубра даецца паляўнічаму толькі тады, калі жывёла хворая або хутка памрэ», — удакладніў Вадзім Кармазін. Ён назваў такое паляванне «элітным» і паведаміў, што тры гады таму падобная ліцэнзія каштавала 30 тысяч еўра.

З 2004 года Беларусь уваходзіць у Сусветную турысцкую арганізацыю. Сёння дзейнічаюць 29 дагавораў у сферы турызму, 22 з якіх — міжурадавыя пагадненні, 7 — міжведамасныя. Найбольш плённае супрацоўніцтва наша краіна вядзе з Літвой, Польшчай, Расіяй, Украінай, Ізраілем, Турцыяй, Венгрыяй. Заключаны дамовы з усімі краінамі СНД, акрамя Узбекістана. Існуюць і пагадненні ў сферы турызму паміж прафсаюзамі і асацыяцыямі. Да таго ж Беларусь мае бязвізавы рэжым з многімі дзяржавамі. «Апроч гэтага, мы ўскладаем вялікія спадзяванні на так званы малы прыгранічны рух з прыбалтыйскімі краінамі, калі грамадзяне, што пражываюць на адлегласці да 50 кіламетраў з абодвух бакоў мяжы, могуць перасякаць яе па спрошчанай схеме», — адзначыў дырэктар дэпартамента па турызме.

Дзіяна СЕРАДЗЮК ■

ПА ДАКУМЕНТАХ — КАТЭДЖ, А РЭАЛЬНА — ШМАТПАВЯРХОВІК

Уявіце сабе наступную сітуацыю. Вы доўгі час жывяце ў прыватным доме ў маляўнічым кутку Мінска. У пяці-дзесяці хвілінах хады ад вашага дома знаходзіцца вялікі парк. Гэтая ідылія доўжыцца дзесяцігоддзі, і вось у адзін прыгожы дзень ідылічную карцінку псуе грукат будаўнічай тэхнікі. На месцы суседняга дома з'яўляецца вялікі катлаван, а пасля паціху пачынае паўставаць будучы катэдж. Узводзіцца трэці паверх, а за ім і чацвёрты... Як грыбы пасля цёплага дажджу, побач з'яўляюцца такія ж шматкватэрныя дамы. Ваша хатка аказваецца заціснутай паміж гмахамі, а на калісьці ціхай вулачцы пачынаюць у два рады паркаваць аўтамабілі. Ужо радзей у хату заглядвае сонейка. І ад былога камфорту застаюцца адны ўспаміны...

— Мы праводзілі шэраг праверачных мерапрыемстваў, і выявілі факты незаконнага ўзвядзення шматпавярховых жылых дамоў на ўчастках, якія выдзяляліся пад будаўніцтва катэджаў альбо двухкватэрных пабудоў. Падчас гэтага парушаліся законныя правы і інтарэсы соцень грамадзян нашай сталіцы, — паведаміў **старшы пракурор аддзела Генеральнай пракуратуры Беларусі Артур ПЕТРАСЯН**. — Злачынцы пры гэтым атрымлівалі нелегальныя даходы ў асабліва буйных памерах.

Зламыснікі дзейнічалі як мінімум сем гадоў, не сустракаючы на сваім шляху ніякіх перашкод. Службовыя асобы выканаўчых і распарадчых органаў улады, якія павінны былі сачыць за новабудоўлямі, фактычна заплюшчвалі вочы на гэтыя парушэнні. Уявіце сабе маштабы: толькі ў адным Першамайскім раёне супрацоўнікі пракуратуры выявілі пяцьдзясят падобных будоўляў! Па адной з іх Следчы камітэт завёў крымінальную справу. У маштабах Мінска гэтая лічба ідзе на сотні выпадкаў, калі не на тысячы...

І вось пракурорскі аўтамабіль прывозіць журналістаў на месца дзеяння, у квартал прыватнай забудовы побач з Севастопальскім паркам. Калісьці ціхая вуліца Пскоўская ператварылася цяпер у вузенькую асфальтавую дарожку, па якой даволі няпроста праехаць з-за прыпаркаваных паабапал аўтамабіляў. Налева і направа выраслі трох- і чатырохпавярховыя шыкоўныя палацы... Пры гэтым інфраструктура раёна засталася нязменнай, разлічанай на аднапавярховыя дамы. Гэта прывяло да незапланаванай нагрузкі на электрычныя сеткі, каналізацыю, водапровад... У выніку за прадпрымальнасць хітруной камфортам пражывання расплачваюцца ўсе жыхары мікрараёна.

— Генеральны план развіцця Мінска прадугледжваў у гэтых кварталах захаванне сядзібнай забудовы, — працягвае Артур Петрасян. — Гэта азначае, што тут могуць знаходзіцца выключна катэджы або двухкватэрныя жылыя дамы. І па ўсіх дакументах тут заяўлялася ўзвядзенне менавіта такіх пабудоў. Але некаторыя прадпрымальныя людзі вырашылі на гэтым зарабіць.

Схема дзеяння зламыснікаў была зусім нескладанай. Сталічны прыватны сектар багаты на старыя драўляныя хаткі, якія размянялі не адзін дзясятак гадоў. Іх афармлялі пры набыцці, як правіла, альбо на членаў сям'і забудоўшчыка, альбо на падстаўных асоб, якім за паслугу плацілі 600-700 долараў. Гэта рабілася, каб выключыць на свой адрас лагічнае, але зусім непатрэбнае для зламысніка пытанне ад падатковых органаў: адкуль у чалавека, які афіцыйна нідзе не працуе, знайшліся дзясяткі тысяч долараў на куплю жылля?

Тэхнічныя дакументы на новабудоўлю, вядома, захоўвалі статус-кво, каб не прыцягнуць да сябе залішнюю ўвагу адпаведных органаў. Насамрэч кожны паверх такога дома ўяўляў сабой мінімум адно ізаляванае памяшканне з усімі яго атрыбутамі. Але па заканадаўстве яно лічыцца ўжо кватэрай у шматкватэрным жылым доме, у які вось такім цудоўным чынам ператвараўся катэдж. Людзі, якія набывалі кватэры ў такіх дамах, па факце купляліі ўсяго толькі... долю. Спачатку на гэта ўвагі не звярталіся. Але калі прыходзіў час рэгістрацыі памяшкання, для шчаслівага ўладальніка новага жылля на роўным месцы ўзнікалі дадатковыя цяжкасці.

Сёння да канца невядома, што ж з гэтымі дамамі рабіць. Каб прывесці іх у стан, які адпавядае генплану, неабходна рабіць, напрыклад, з трох кватэр адну. Справа ў тым, што па праектнай дакументацыі гэтыя дамы мусяць жа быць максімум двухкватэрнымі!

Супрацоўнікі Генеральнай пракуратуры праводзяць дадатковую праверку, па выніках якой будзе дадзена ацэнка дзейнасці службоўцаў выканаўчай улады, на якіх ускладаўся кантроль за новабудоўлямі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска» (информация о застройщике и проекте строительства)

Застройщик – коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 18.11.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Загородный, 4-й, д. 64а. Тел./факс 204-67-99, 252-32-18.

Режим работы – 8.45 – 17.45, обед 13.00 – 13.45; пятница 8.45 – 16.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1) жилой дом № 70 по ул. Одоевского;
2) жилой дом № 99В по ул. М. Лынькова;
3) жилой дом № 5 по ул. Карского;
4) жилой дом № 3 по ул. Карского;
5) жилой дом № 2 по ул. Ю. Семеняко;
6) жилой дом № 26 по ул. Ю. Семеняко;
7) жилой дом № 28 по ул. Ю. Семеняко;
8) жилой дом № 30 по ул. Ю. Семеняко;
9) жилой дом № 14 по ул. Ю. Семеняко;
10) жилой дом № 22 по ул. Ю. Семеняко;
11) жилой дом № 24 по ул. Ю. Семеняко;
12) жилой дом № 3 по ул. К.Т. Кириенко;
13) жилой дом № 3 по 2-му пер. С.К. Тимошенко.
14) жилой дом № 4 по ул. Ю. Семеняко;
15) жилой дом № 6 по ул. Ю. Семеняко.

Застройщиком получены:

- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный председателем Минского городского исполнительного комитета 01.07.2011 г.
- экспертные заключения РУП «Главгосстройэкспертиза» от 03.03.2011 г. № 70-15/11, от 01.08.2012 г. № 392-15/12, от 25.06.2013 № 584-15/13
- решение Мингорисполкома от 26.10.2011 г. № 3256/1 о разрешении строительства.
- разрешение инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 13.02.2012 г. № 2-208Ж-127/11.
- договор строительного подряда с ОАО «Минскпромстрой» в качестве генерального подрядчика от 05.2013 г. № 9/2013.

Информация о проекте.

Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланквыд» по ул. Я. Мавра, 32А расположен во Фрунзенском районе г. Минска на земельном участке площадью 1,9087 га, предоставленном КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска» решением Мингорисполкома от 16 июня 2011 г. № 1707 во временное пользование, сроком до 11 ноября 2014 г., для строительства объекта.

Проектная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Главгосстройэкспертиза» (экспертные заключения от 03.03.2011 г. № 70-15/11, от 01.08.2012 г. № 392-15/12, от 25.06.2013 г. № 584-15/13).

Реализация проекта осуществляется на основании акта выбора места размещения земельного участка для строительства объекта «Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланквыд» по ул. Я. Мавра, 32А».

Объект проектирован с делением на 7 пусковых комплексов, в том числе:

- 4-й пусковой комплекс – офисные помещения № 1, офисные помещения № 2, фитнес-центр (2 ур.), досуговый центр, салон красоты, мастерская бытового обслуживания, аптека, цветочный магазин;
- 5-й пусковой комплекс – магазин продовольственных товаров (2 ур.);

Сведения о цене на объект долевого строительства (на дату опубликования проектной декларации).

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 года № 263 («О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь») для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагается, по состоянию на дату опубликования проектной декларации:

- офисное помещение № 1 общей площадью 629,8 кв.м.

Цена 1 кв.м общей площади по состоянию на дату опубликования проектной декларации сформирована в ценах апреля 2013 года с учетом прогнозных индексов цен в строительстве и составила 17 131 000 (Семнадцать миллионов сто тридцать одна тысяча) белорусских рублей. Цена объекта будет корректироваться на протяжении строительства объекта с учетом изменения статистических индексов изменения стоимости строительно-монтажных работ;

- офисное помещение № 2 общей площадью 723,4 кв.м.

Цена 1 кв.м общей площади по состоянию на дату опубликования проектной декларации сформирована в ценах апреля 2013 года с учетом прогнозных индексов цен в строительстве и составила 17 131 000 (Семнадцать миллионов сто тридцать одна тысяча) белорусских рублей. Цена объекта будет корректироваться на протяжении строительства объекта с учетом изменения статистических индексов изменения стоимости строительно-монтажных работ;

- аптека общей площадью 137,1 кв.м.

Цена 1 кв.м общей площади по состоянию на дату опубликования проектной декларации сформирована в ценах апреля 2013 года с учетом прогнозных индексов цен в строительстве и составила 22 601 000 (Двадцать два миллиона шестьсот одна тысяча) белорусских рублей. Цена объекта будет корректироваться на протяжении строительства объекта с учетом изменения статистических индексов изменения стоимости строительно-монтажных работ;

- магазин продовольственных товаров общей площадью 1281 кв.м.

Цена 1 кв.м общей площади по состоянию на дату опубликования проектной декларации сформирована в ценах апреля 2013 года с прогнозных индексов цен в строительстве и составила 22 553 000 (Двадцать два миллиона пятьсот пятьдесят три тысячи) белорусских рублей. Цена объекта будет корректироваться на протяжении строительства объекта с учетом изменения статистических индексов изменения стоимости строительно-монтажных работ;

- мастерская бытового обслуживания общей площадью 291,1 кв.м.

Цена 1 кв.м общей площади по состоянию на дату опубликования проектной декларации сформирована в ценах апреля 2013 года с учетом прогнозных индексов цен в строительстве и составила 20 217 000 (Двадцать миллионов двести семнадцать тысяч) белорусских рублей. Цена объекта будет корректироваться на протяжении строительства объекта с учетом изменения статистических индексов изменения стоимости строительно-монтажных работ.

Предполагаемый срок ввода объекта долевого строительства 4-го пускового комплекса – май 2015 года.

Предполагаемый срок ввода объекта долевого строительства 5-го пускового комплекса – июнь 2015 года.

С планировкой объекта долевого строительства и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. Загородный 4-й, д. 64а, к. 102, тел. 252-32-18.

Для заключения договора необходимо

✓быть готовым оплатить в течение 5 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.

«КІНУЛІ» ДЗЯРЖАВУ...

Камітэт дзяржаўнай бяспекі спыніў злачынную дзейнасць міжнароднай групы, якая завозіла на тэрыторыю Мытнага саюза грузавыя аўтамабілі і аўтобусы без выплаты мытных плацяжоў. У ценявую схему былі ўцягнуты і супрацоўнікі беларускай мытні, якія атрымлівалі ад камерсантаў грашовыя ўзнагароджванні, а таксама грамадзяне Беларусі, Расіі і Польшчы.

Двое індывідуальных прадпрымальнікаў з Бярозы Брэсцкай вобласці набывалі ў краінах Еўрасаюза поўнакамплектныя аўтамабілі, а для ўхілення ад мытных плацяжоў у поўным аб'ёме завозілі іх на тэрыторыю Мытнага саюза па частках (шасі і кабіны), паведамляе прэс-служба КДБ Беларусі. Далей у Беларусі або Расіі камплектаваўся прыдатны для эксплуатацыі аўтамабіль. Аналагічна завозіліся і аўтобусы (здымаліся рухавікі і хадавая част

Ігуменскі тракт

№ 34 (49)

МЭР, капелюшы здымаем перад вамі...

Ці гатовы сталічныя ўлады ўшанаваць славутага папярэдніка?

Сталічная грамадскасць днямі сабралася, каб абмеркаваць увекавечванне памяці славутага мінскага мэра — Караля Чапскага — пэўна, самага вядома і дзейснага з усіх, што былі ў беларускай сталіцы.



Кароль ЧАПСКІ.

Каб адразу зняць усе пытанні, а хто ж такі Кароль Чапскі і чаму, уласна кажучы, мы павінны яго ўшаноўваць, напачатку варта прыгадаць, што ж зрабіў гэты прадпрымальны чалавек. Кароль Чапскі кіраваў беларускай сталіцай з 1890-га па 1901 год і праявіў сябе як мэр-наватар і надзвычай добры гаспадарнік. Дарэчы, Кароль быў каталіком, а прадстаўнікам гэтага веравызнання ў тыя часы не дазвалялася займаць высокія пасады. Аднак ён быў адным з самых багатых у сваім асяроддзі, меў добрую рэпутацыю, таму ўсё-такі атрымаў такую высокую пасаду. І яшчэ двойчы пераабіраўся на яе.

Калі не ўдавалася з казны атрымаць грошы для чарговага новаўвядзення, Кароль... адкрываў свой кашалёк і плацiў.

Род Чапскіх на той час быў пароднены літаральна з усёй Еўропай. Таму Кароль, часам бываючы за мяжой і ведаючы тамашнія дасягненні і цікавінкі, марыў, каб і Мінск стаў горадам на ўзроўні Парыжа, Санкт-Пецярбурга, Варшавы. Усе свае планы і мары адразу імкнуўся ажыццявіць.

Кароль Чапскі праклаў першую конку — фурманкі, запрэжаныя коньмі, сталі на рэйкі. Ды і самі вуліцы, цэнтральныя, што ішлі да вакзалаў і яго ўласных прадпрыемстваў, мэр зрабіў брукаванымі. Ён з'яўляецца стваральнікам першай мінскай электрастанцыі. Сучасны піўзавод «Аліварыя» — таксама яго пачынанне, для якога Кароль Чапскі купіў будынак і новае меднае абсталяванне.

Як і ў сапраўдным еўрапейскім горадзе, у Мінску нарэшце з'явілася каналізацыя. Першыя ліхтары, прыкладна 100 штук, у цэнтры сталіцы таксама ўпершыню заззялі пры Чапскім. Кароль, які быў дбайным гаспадаром, знайшоў, дзе купіць іх нашмат танней.

Прыкмета сапраўднай еўрапейскасці таго часу — гэта спорт. Таму гарадскі галава зрабіў вельмі шмат, каб мінчане сталі спартыўнымі. У Цэнтральным парку імя Горкага (на той час гарадскім садзе) давалі напракат веласіпеды — гэта таксама было надзвычай дарагой на той час забавай. Пад суправаджэнне прыемнай музыкі ў парку сталі працаваць і іншыя спартыўныя секцыі.

Менавіта пры Чапскім было скончана будаўніцтва тэатра імя Янкі Купалы. Мэр паклапаціўся пра тое, каб у горадзе адкрыліся лазні, дабрачынныя сталовыя. Як ні дзіўна, але ўпарадкаваў ён і публічныя дамы. У кожным з іх з'явіўся фельчар, на некалькі дамоў быў адзін урач, які абследаваў і лячыў «начных матылькоў». Кажуць, калі Чапскі памёр, прастытуткі хацелі ўстанавіць яму помнік з золата...

Калі казаць пра іншыя крыніцы папаўнення яго бюджэту, то меў ён і дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы, і віна-водачны завод у Станькаве. Мінск на той час быў зусім небагатым. Таму, калі не ўдавалася з казны атрымаць грошы для чарговага новаўвядзення, Кароль нярэдка адкрываў... свой кашалёк і плацiў. Аднак усе тыя фінансы, якія горад быў павінен мэру, пасля яго смерці сям'і амаль не вярнулі.

Памёр Чапскі ад сухотаў у 1904 годзе. Пахавалі яго ў сямейнай крыпце ў Станькаве (гэта месца знаходзіцца насупраць сучаснай школы). Аднак крыпта была разбурана, і цяпер там толькі парослы бярозамі ўзгорак... А вось архітэктар Алег Масліеў адшукаў у ёй рашотку, якую перадаў музею. Такім чынам, месца пахавання славутага мэра беларускай сталіцы вядомае, але ніяк не ўвекавечана.

У Цэнтральным парку імя Горкага калісьці была пакладзена пліта з надпісам: «Тут будзе стаяць помнік Каралю Чапскаму». Аднак сваё прызначэнне пліта пакуль так і не выканала і таму застаецца пустой...

На піўзаводзе «Аліварыя» пра Караля Чапскага расказваюць падчас дэгустацый. Аднак памятнай дошкай у гонар заснавальніка завода пакуль не абзавяліся. У Купалаўскім тэатры таксама ведаюць пра ролю славутага мэра ў адкрыцці іх установы, разлічваюць звесткі пра яго змясціць сярод іншых, што сведчаць пра людзей, якія зрабілі значны ўклад у жыццё тэатра.

На пасяджэнні «круглага стала», прысвечаным Каралю Чапскаму, дырэктар мясцовага гісторыка-культурнага фонду «Ляліва» (Ляліва — герб роду Чапскіх) Іван Гардзіеўскі расказаў пра цвёрды намер увекавечыць памяць сталічнага мэра. Гардзіеўскі прадстаўляе «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў». Да гэтай справы падключыліся таксама Беларускі саюз прадпрымальнікаў, Беларускі фонд культуры, Беларускае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускі камітэт міжнароднай Рады па помніках і памятных мясцінах, Музей гісторыі горада Мінска, іншыя ўстановы і грамадскія дзеячы.

Падчас абмеркавання было прапанавана адну з вуліц Мінска назваць іменем Караля Чапскага, зрабіць памятныя дошкі ў яго гонар, каб устанавіць іх на будынках піўзавода «Аліварыя» і Купалаўскага тэатра. Таксама ўсталяваць помнік Чапскаму (пліту, барэльеф або штосьці іншае) у Цэнтральным парку імя Горкага. Зразумела ж, зрабіць пліту на месцы пахавання Чапскага ў Станькаве.

Калі Кароль Чапскі памёр, прастытуткі хацелі ўстанавіць яму помнік з золата.

На месцы былой электрастанцыі, на рагу новазбудаванага атэля прадугледжана штосьці накшталт музея, з экспазіцыі якога можна будзе атрымаць пэўныя звесткі пра мэра. Саюз прадпрымальнікаў плануе ўвесці новую ўзнагароду — «ордэн імя Чапскага» — які стануць уручаць не толькі прадпрымальнікам, але і грамадскім дзеячам.

Гучала думка стварыць паўнавартасны мастацкі фільм на тэму жыцця і дзейнасці славутага мэра (некалькі дакументальных ужо ёсць). А ў наступным годзе, калі будзе адзначацца 110 гадоў з дня яго смерці, зладзіць сумесны вялікі баль у гонар Чапскага і Агінскага.

Падаецца, імя Караля Чапскага было незаслужана забыта ў беларускай сталіцы. Грамадскасць вырашыла гэта выправіць. Аднак ці гатовы гарадскія ўлады падтрымаць ушанаванне жыцця і дзейнасці славутай асобы?..

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Акцыя

«ЗЯЛЁНЫ СУБОТНІК» У СЯДЗІБЕ АДАМА ХМАРЫ

Як валанцёры могуць дапамагчы помнікам культуры?

Чырвоная цэгла, разбураныя сцены — нібыта крык аб дапамозе. Палацава-паркавы ансамбль XVIII стагоддзя ў вёсцы Сёмкава рыхтаваўся да зімы. Дапамагалі людзі. Прыехалі з інструментамі, з жаданнем працы і сталі прыбіраць сядзібу, рыхтуючы яе да кансервацыі на зіму. Яна аддзячыла, як заўсёды бывае ўдзячная гісторыя за цікавасць да яе. Падчас прыбірання ўдалося знайсці фрагменты пячной разной цэглы і старога посуду. І гэта пры тым, што на працягу двух гадоў на тэрыторыі сядзібы ў Сёмкаве вядуцца археалагічныя работы. Усё, што адкрывае гістарычная сядзіба, потым можна пабачыць у музейнай экспазіцыі, якая знаходзіцца тут. Але ж кожнага, хто дакранаецца да даўніны, чакае свая ўзнагарода.

Сядзіба з часоў Рэчы Паспалітай была пабудавана па жаданні мінскага ваяводы Адама Хмары. Італьянскі архітэктар Карла Спампані дапамог увасобіць гэтыя мары. Але стагоддзі не былі літасцівыя да будынка, як яны не шкадавалі таго, што стваралі людзі на радасць сабе і іншым дзеля ўтульнасці сваёй і прыгажосці зямлі, на якой жылі. Цяпер тут вядуцца навуковыя работы: перш чым адраджаць, трэба ведаць, што і як было калісьці. І часам сапраўды не хапае часу і сіл на тое, каб правесці элементарныя работы па добраўпарадкаванні. Тады дарэчы дапамога валанцёраў, адзначыў гісторык і краязнавец Павел Каралёў.

Акцыю «Зялёны суботнік. Вострaў скарбаў» наладзілі супрацоўнікі кампаніі «Брытыш Амерыкан Табака» — прыклад таго, як можна не проста ствараць бізнес у краіне, але і прыносіць канкрэтную карысць, дапамагаючы добраўпарадкаваць помнікі культуры. Яшчэ і карысць для сябе: калі сам, сваімі рукамі «памацаў» гісторыю, папрацаваў на будучыню ў кампаніі з калегамі, сябрамі, роднымі, то ўзнікае еднасць не толькі працоўная, але і чалавечая. Акрамя таго, датычнасць да сучаснай гісторыі, якая пішацца ў краіне. Такія акцыі сталі ўжо бадай традыцыйнымі для супрацоўнікаў кампаніі.

Сёмкава вельмі чакае любую дапамогу. І нават праца па вызваленні тэрыторыі ад смецця, цаглянай крошкі і зямлі — гэта таксама спроба ўпрыгожыць месца, якое стамілася быць занядбаным. Крок да таго моманту, калі рукі рэстаўратараў дакрануцца да гэтай засмучанай цэглы. Рэстаўрацыя, згодна з планамі ў сядзібе Адама Хмары, пачнецца толькі ў 2015 годзе. А колькі яшчэ гадоў ды і сродкаў спатрэбіцца на яе рэалізацыю, перш чым мы пабачым будынак зноў прыгожым і абжытым людзьмі! Ён хоча быць карысным людзям, але спачатку людзі могуць прынесці карысць яму. Нават у выглядзе звычайнага добраўпарадкавання яго тэрыторыі.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Ад першай асобы

З ДРАНІКАМІ НЕ ПАСПРАЧАЕШСЯ,

або Што зрабіць, каб захаваць жывую спадчыну?

2013 год у Беларусі праходзіць пад знакам «жывой спадчыны». Таму карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з загадчыкам аддзела аховы гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі Алай СТАШКЕВІЧ, каб паразважаць над тым, што пагражае існаванню нематэрыяльнай спадчыны і што можа яе ўратаваць.

«БРЭНД ПЕРАХОДЗІЦЬ З ПАКАЛЕННЯ Ў ПАКАЛЕННЕ»

Ала СТАШКЕВІЧ.

— У некага можа ўзнікнуць пытанне: чаму трэба захоўваць нематэрыяльную спадчыну? Таму што гэта адзін з наймагутнейшых ідэнтыфікатараў нашай нацыі. Песня, танец, ежа, касцюм, рамёствы — нішто так не характарызуе нацыянальнае адзінства і не адрознівае нас ад іншых. Возьмем, напрыклад, Італію. Яе сімвалы — спагеці, піца, віно — яе нацыянальная кухня. Таму хацелася, каб і ў Беларусі былі падобныя адметнасці, калі мы хочам захавацца як народ.

Цяпер у нашай краіне актыўна шукаюць нацыянальны брэнд. Аднак усё тое, што я пералічыла, — гэта і ёсць брэнд. Бо яно закранае духоўны ўзровень і псіхалогію, адлюстроўвае наш менталітэт, усебакова паказвае краіну.

Ні спорт, ні сучасныя выдумкі маркетолагаў не з'яўляюцца брэндам. Бо брэнд — гэта тое, што пераходзіла з пакалення ў пакаленне на працягу стагоддзяў. І гэта нельга аспрэчваць. Бо як могуць аспрэчвацца жніўныя песні Беларусі, наша шматгалоссе, нашы дранікі?

СЕНІ — МЕСЦА ДЛЯ ЭКШНА

— У свеце Беларусь ведаюць па абрадзе вёскі Семежава Капыльскага раёна «Калядныя цары», які занесены ў Сусветны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Аднак тое, што такая традыцыя захавалася менавіта ў гэтым месцы, невыпадкова. Бо там існуе культурны ландшафт і самі жыхары — кансерватары. Яны працягваюць заставацца ў сваіх традыцыйных дамах, пагонных дварах. Вяскоўцы зрабілі рамонт і працягваюць жыць у іх. Там некалькі такіх вуліц. Калі б не было гэтых пагонных двароў, то і традыцыя не з'явілася б: проста не было б месца для народнага тэатра. Пагонныя дварыы — гэта калі ўсе гаспадарчыя будынкі і сама хата будуюцца ў адзін рад. Прычым з хатай іх яднаюць вялізныя сені. У звычайным доме сені могуць змясціць, верагодна, толькі сям'ю. Гэтыя ж велізарныя сені, памерам у 30 метраў, маглі прыняць яшчэ і ўсіх калядоўшчыкаў. Тут і можна было стварыць увесь гэты экшн: паказваць дзею цара Максіміліяна і цара Мамая — добрых і злых сіл.

Дарэчы, знойдзены архіўныя дакументы, у якіх гаворыцца, што ў XVIII стагоддзі яе жыхароў выкарыстоўвалі як дваровых у маёнтку Радзівілаў у Нясвіжы. Яшчэ на пачатку XIX стагоддзя ў вёсцы фіксуюцца кірмашовыя прафесіі: штукары (жанглёры), дрэсіроўшчыкі мядзведзяў. Сярод вяскоўцаў былі людзі, якіх бралі ў радзівілаўскі палац. Можна прапанаваць такую гіпотэзу, што калісьці яны выконвалі пэўныя ролі ў пацешных баях на Альбе, якія ладзіў Кароль Радзівіл «Пане Каханку», або дапамагалі ў арганізацыі тэатра Уршулі Радзівіл. Пэўна, яны дзесьці падгледзелі, што не толькі лялькі, але і людзі могуць выконваць ролі.

Цікава, што абрад «Калядныя цары» ў свой час забаранялі, але ў 1996 годзе яго аднавілі. І не высілкамі клубных работнікаў, а дзякуючы самім носьбітам з Семежава, якія ўспомнілі, што ў іх ёсць традыцыя, якую шмат хто яшчэ памятае, і аднавілі яе.

У гэтай вёсцы існуе і ўнікальнае ткацтва, якое мае архаічныя рысы і практыкуецца цяпер. Захавалася выключна цікавая традыцыйная ежа, прычым не адна-дзве стравы, а цэлая сістэма: і святочныя, і будзённыя. Дзякуючы падтрымцы спонсараў нядаўна выдадзена кніжка «Традыцыйная ежа Семежава».

ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНА ДЗЯРЖПРАГРАМА!

— Праўда, мы маем усяго некалькі вёсак, як Семежава, якія могуць самастойна падтрымаць сваю народную культуру. Іншым пагражае знікненне. Таму цяпер неабходна дзяржаўная праграма па захаванні нематэрыяльнай спадчыны. Бо такая спадчына — з'ява вельмі далікатная і залежыць ад многіх фактараў. Яна ставіцца пад пагрозу знішчэння тады, калі знішчаецца аграландшафт, традыцыйная архітэктура, што можна назіраць сёння. Мала ў якіх вёсках засталося традыцыйнае жыллё. У асноўным на яго месцы будуюцца сучасныя катэджы, безадносна да тых вялікіх традыцый, якія ёсць на Беларусі, разворваюцца ландшафтныя зоны, дзе адбываліся тыя або іншыя падзеі. Гэтае імкненне да ўніфікацыі і глабалізацыі ўсёй нашай культурнай прасторы вельмі негатыўна ўздзейнічае на існаванне нематэрыяльнай спадчыны.

Ёсць элементы, якім пры невялікіх затратах нічога не пагражае. Я маю на ўвазе традыцыйную ежу. Калі да яе з розумам ставіцца, яна можа выкарыстоўвацца і ў сучасным рэстаранным бізнесе. Гэта наша адметнасць. Яна прыжылася сёння — адкрываюцца рэстараны нацыянальнай кухні. Або рэлігійныя цырыманіі: напрыклад Будслаўскі фэст ці Жыровіцкая пілігрымка — гэта складана разбурыць, бо яно на ўзроўні самасвядомасці. Людзі будуць захоўваць іх яшчэ вельмі доўга. Аднак многія рамесніцкія, абрадавыя, песенныя, танцавальныя практыкі патрабуюць больш уважлівага стаўлення і, магчыма, спецыяльнай праграмы падтрымкі і фінансавання.

Песня, танец, ежа, касцюм, рамёствы — нішто так не характарызуе нацыянальнае адзінства

ЗАЎСЁДЫ АНЛАЙН...

— Праца па падтрымцы нематэрыяльнай спадчыны ў нашай краіне ўжо вядзецца. Для гэтай мэты ЮНЕСКА, па просьбе Беларусі, выдзеліла грант, разлічаны на два гады. У рэгіёнах створаны спецыяльныя камісіі, у якія ўвайшлі эксперты, метадысты, самі носьбіты пэўных традыцый. Яны ездзілі па сваёй мясцовасці, гутарылі з людзьмі і склалі першасныя спісы. Некаторыя элементы з іх сталі вылучаць на ўключэнне ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Ствараецца база даных усёй нематэрыяльнай культурнай спадчыны нашай краіны. Адлюстраваннем працы стаў сайт, які так і называецца — «Жывая спадчына» (www.livingheritage.by).

З'явіўся тэрмін нематэрыяльнай культурнай спадчыны, і быў прызнаны сам факт яе існавання.

Асноўныя палажэнні Канвенцыі ЮНЕСКА аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны ад 2003 года, якую наша краіна таксама падпісала, пераведзены на ўзровень дзяржаўнага заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Калі вы з'яўляецеся спадчыннікам адметных праяў народнай культуры (рамяства, песні, танца, кухні і інш.), вы можаце запоўніць анкету на сайце www.livingheritage.by і распавесці пра свае здольнасці або даслаць ліст на адрас: 220086, г. Мінск, вул. Каліноўскага, 12. Інстытут культуры Беларусі, аддзел аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

СУПОЛЬНАСЦЬ — ХТО ТЫ?

— Нематэрыяльная спадчына працягвае жыць толькі тады, калі адбываецца яе пераемнасць. Таму трэба рабіць усё, каб дзеці ведалі, чым жылі іх продкі. І мясцовыя жыхары, і ўлада, і школы, і цэнтры культуры — усё гэта і ёсць супольнасць, якая павінна разам бараніць сваю культуру.

Зразумела, неабходна ўключаць нематэрыяльную спадчыну ў эканамічныя праграмы. Бо, калі вёска жыве і там ёсць моладзь, гэта ўсё не загіне. Але калі вёска памірае і носьбітамі з'яўляюцца толькі людзі сталага веку, якім больш за 70 гадоў, то варта падключыць штучныя механізмы, іначай штосьці вельмі важнае будзе страчана на працягу 5 гадоў...

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

P.S. *Газета «Звязда» актыўна падтрымлівае і папулярызуе тэму нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Яе праявы ёсць у кожнай вобласці нашай краіны, пацвярджэнне таму — серыя фотаздымкаў Анатоля КЛЕШЧУКА.*

Абрад «Юраўскі карагод» у вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

Калядны абрад «Конікі» ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.

Каравайніца Валянціна Уласік, г. Стоўбцы Мінскай вобласці.

Майстар Мар'ян Скрамблевіч вырабляе музычныя інструменты, г. Гродна.

Зажыначны абрад «Завіванне барады». Выканаўцы — удзельніцы фальклорнага калектыву «Матырынская спадчына», в. Матырына Ушацкага раёна Віцебскай вобласці.

Шапавальства. Майстры — сям'я Асіпоўскіх: Станіслаў, Марыя і іх сын Уладзімір. в. Пакуцце Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці.

Сяргей МАСКЕВІЧ:

«ЗАКРЫВАЦЬ ПРЫВАТНЫЯ ІНСТЫТУТЫ НІХТО НЕ БУДЗЕ»

У рэдакцыі «Звязды» прайшла «прамая лінія» з міністрам адукацыі Сяргеем Маскевічам. Адказы на найбольш важныя і цікавыя пытанні мы змяшчаем на старонках газеты.

Віцебскія настаўнікі:

Сяргей Аляксандравіч, калі прымалася рашэнне аб павелічэнні нагрузкі на педагогаў, то чым кіраваліся? Нагрузка 18 гадзін захоўвалася з даваенных часоў мінулага стагоддзя. І нават 18 гадзін не заўсёды ўдавалася выкраіць у штатным раскладзе. Цяпер трэба шукаць 20 гадзін. Іх няма. Як можна знайсці 20 гадзін настаўніку пачатковых класаў, калі ўрокі замежнай мовы вядзе настаўнік замежнай мовы, урокі фізічнай культуры — настаўнік фізкультуры. Нават за кошт факультатываў праблематычна іх набраць. А для тых, хто працаваў больш чым на стаўку, нічога не змянілася. Лепш бы павялічылі колькасць гадзін арганізацыйна-выхаваўчай работы, якія аплачваюцца. Ці павялічылі даплаты за кваліфікацыйныя катэгорыі.

— Пагадзіцеся, умовы працы настаўнікаў сёння і 20—30 гадоў назад — гэта дзве вялікія розніцы. Ёсць тэхналогіі, якія дазваляюць значна спрасціць работу настаўніка, педагогам даступна шмат метадычнай літаратуры, праграмнай дакументацыі, тэхнічных сродкаў навучання. Інтэнсіфікацыя працы зусім іншая. Таму настаўнік, які працуе на стаўку, можа выканаць большы аб'ём работы. Між іншым, у савецкія часы на аднаго настаўніка прыпадала 10 вучняў, а сёння на аднаго настаўніка ў нас прыпадае 8,4 вучня. Для параўнання: у Літве — 12 вучняў, а ў Германіі — 14. У параўнанні з іншымі краінамі паказчык колькасці педагогаў у адносінах да колькасці навучэнцаў у нас адзін з самых высокіх.

Да таго ж пытанне аб павелічэнні гадзін на стаўку дэталёва прапрацоўвалася з улікам рэальнай сітуацыі. У папярэднім навучальным годзе педагагічная нагрузка на настаўнікаў складала па краіне ў сярэднім 1,2 стаўкі. У гарадскіх школах мала хто з настаўнікаў працаваў на стаўку. Пытанні з нагрузкай, як правіла, узнікаюць у малакамплектных сельскіх школах, дзе з-за дэмаграфічнай сітуацыі колькасць навучэнцаў працягвае змяншацца. Мы працуем сёння над гэтым пытаннем. Безумоўна, трэба прадастаўляць педагогам магчымасць праз сістэму дадатковай адукацыі павысіць сваю прафесійную кампетэнцыю, каб, скажам, настаўнікі пачатковых класаў маглі весці ў сваім класе ўрокі музыкі ці фізічнай культуры. Што тычыцца настаўнікаў геаграфіі, то ў рэгіёнах ёсць вопыт работы прадметнікаў у некалькіх школах.

Навучальны працэс не павінен страціць у якасці, але выконвацца ён будзе меншай колькасцю занятых. Пры гэтым выдаткі на адукацыю не павінны змяншацца, а памеры заробкаў павінны расці. Большая нагрузка — большыя заробкі. Гэта наша мэта. Для таго, каб больш зарабляць, трэба больш інтэнсіўна і эфектыўна працаваць.

Як вынікае з інфармацыі, якую мы атрымалі ад упраўленняў адукацыі аблвыканкамаў і Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, павелічэнне педагагічнай нагрузкі не пацягнула за сабой у гэтым навучальным годзе звальнення педагагічных работнікаў. Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі больш як 96% педагогаў працуюць з нагрузкай 20 і больш гадзін на тыдзень.

Няпоўная вучэбная нагрузка ўстанаўлівалася толькі пры наяўнасці згоды работніка ці па заявах работнікаў, якія з тых ці іншых прычын не могуць выконваць нагрузку ў поўным аб'ёме. Больш за палову з тых, хто працуе на няпоўную стаўку, — гэта асобы, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту. Упэўнены, што гэта задача кіраўніка ўстановы адукацыі — вырашыць усе арганізацыйныя пытанні, звязаныя з нагрузкай на членаў педагагічнага калектыву.

«Сёння мы разглядаем магчымасць перайсці да абавязковага павышэння кваліфікацыі педагогаў раз на тры гады, а не раз на пяць гадоў, як цяпер»

Аляксандр Шаўко, г. Мінск:

— Хацелася б даведацца, ці адменяць калі-небудзь у школе «ўсенавуч». Мая жонка працуе настаўніцай і, шчыра кажучы, я баюся яе адну адпускаць хадзіць па чужых кватэрах. Таму ходзім удваіх. Вось такія ў нас цікавыя сямейныя вечары...

— Тая работа, якая кладзецца на плечы настаўнікаў, — надзвычай важная. Дзякуючы ім мы маем дакладную карціну па колькасці дзяцей, якія пражываюць на тэрыторыі, замацаванай за ўстановай адукацыі, і няўлічаных дзяцей у нас няма. У нашай краіне абавязковая базавая адукацыя. І для нас вельмі важна, каб ніводнае дзіця не згубілася. Амаль кожны год узнікаюць пытанні прыкладна па 600 дзецях, якія з адной установы забралі свае дакументы, а да другой не дайшлі. Вы можаце сказаць, што ўсю інфармацыю па жыхарах прылеглых дамоў можна атрымаць у ЖЭСах або ў таварыствах уласнікаў. Але ж гэта не так. Многія сем'і жывуць на здымных кватэрах, і інфармацыяй пра іх у ЖЭСах не валодаюць. Да таго ж мікрараёны ў гарадах будуюцца вельмі імкліва і сітуацыя хутка змяняецца. Згодны, што гэта сістэма павінна змяняцца па сваіх механізмах і арганізацыі. Пакуль што гэта выключна руцінная работа. Але нічога новага мы не прыдумалі. На педагогаў ускладзена вельмі важная функцыя, і яны з ёю спраўляюцца.

Васіль Савіцкі, былы настаўнік, ужо пенсіянер, Ляхавіцкі раён:

— Сяргей Аляксандравіч, як вы лічыце, ці выконваюць метадычныя кабінеты сваю ролю ў павышэнні прафесійнага майстэрства настаўнікаў? Ці хапае ў людзей, якія там працуюць, вопыту? Чаму можа навучыць настаўніка метадыст, які мае некалькі гадоў стажу работы ў школе ці ўвогуле яго не мае? Я ведаю выпадкі, калі пасады метадыстаў замест вопытных педагогаў займаюць маладыя спецыялісты. Магчыма, метадычная служба сябе зжыла?

— У выніку аптымізацыі штатная колькасць метадычных службаў была прыведзена ў адпаведнасць з новымі нарматыўнымі дакументамі. І сёння яна вагаецца ад 6 да 9 ставак. Зразумела, што колькасць метадыстаў у раённых службах не ахоплівае ўвесь спектр прадметаў. Але сёння перад метадыстамі і не стаіць задача навучыць педагогаў. Метадычная служба раённага ці гарадскога звяна выконвае перш за ўсё арганізатарскія функцыі.

Настаўнік павінен сам вызначаць напрамкі свайго развіцця і прафесійнага росту. Ніхто не перашкаджае яму працаваць з інстытутамі развіцця адукацыі, Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі. А метадысты павінны аказаць педагогу дапамогу — падказаць, праз якую форму павышэння кваліфікацыі гэта лепш зрабіць. Метадыст павінен арганізоўваць абмен педагагічным вопытам, дапамагчы настаўніку аформіць гэты вопыт. Адным словам, задачы метадыста змяніліся. Ён ужо стаіць не над настаўнікам, а побач з ім.

Я ўпэўнены, што настаўнік павінен павышаць сваю кваліфікацыю і самаўдасканальвацца штодня. Між іншым, сёння мы разглядаем магчымасць перайсці да абавязковага павышэння кваліфікацыі педагогаў раз на тры гады, а не раз на пяць гадоў, як цяпер. Перападрыхтоўка можа стаць больш частай, але, магчыма, менш працяглай па часе.

Уладзімір Іванавіч, г. Клімавічы:

— Калі будзе выконвацца рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 14 лістапада 2012 года № Р-778/2012 «Аб кампенсацыі сродкаў, выдаткаваных дзяржавай на падрыхтоўку выпускнікоў устаноў вышэйшай і іншай адукацыі, пры іх добраахвотным паступленні на ваенную службу»?

— Рашэнне Канстытуцыйнага Суда будзе рэалізавана пасля ўнясення ў Кодэкс Рэспублікі Беларусі «Аб адукацыі» запланаваных змяненняў.

Выкладчык БДУІР:

— Сяргей Аляксандравіч, вы — фізік. Цікава, а як вы самі ацэньваеце ўзровень выкладання фізікі ў школе? Чаму ў нас школьнікі так дрэнна здаюць фізіку на ЦТ?

— Лічу, што колькасць гадзін, што выдзяляюцца на вывучэнне фізікі ў школе, недастатковая. Вось гэта і ёсць галоўная прычына. Мы гэту сітуацыю паступова выпраўляем: ужо ў бягучым навучальным годзе ў шэрагу школ матэматыка і фізіка пачалі выкладацца на павышаным узроўні. І тыя школьнікі, якім фізіка цікавая і патрэбная для атрымання далейшай адукацыі, могуць арыентавацца на профільныя класы. Шчыра кажучы, у апошнія гады многія выпускнікі з добрай падрыхтоўкай пераарыентаваліся з вострадэфіцытных для нашай эканомікі інжынерна-тэхнічных спецыяльнасцяў на эканамічныя і гуманітарныя: юрыспрудэнцыю, міжнародныя адносіны і іншыя. Мы хочам гэтую тэндэнцыю зламаць.

Пакуль што класаў з павышанай (профільнай) падрыхтоўкай, магчыма, не так і шмат. Але для арганізацыі адукацыйнага працэсу з вывучэннем прадметаў на павышаным узроўні павінен выконвацца шэраг умоў. Па-першае, абавязкова павінна прысутнічаць гатоўнасць і зацікаўленасць у гэтым вучняў і іх бацькоў. Па-другое, «паглыбленне» ў навучанні немагчыма без прысутнасці ў школе высокакваліфікаваных педагагічных кадраў (настаўнікаў першай, вышэйшай катэгорый або настаўнікаў-метадыстаў). Пад увагу таксама бралася і матэрыяльна-тэхнічная база школы: ці дазваляе яна ў поўным аб'ёме рэалізаваць змест вучэбнай праграмы на павышаным узроўні? Пры вывучэнні на павышаным узроўні фізікі і матэматыкі ў 10-м і 11-м класах прадугледжваецца па 4 гадзіны фізікі і 5 гадзін матэматыкі штотыднёва.

«Навучальны працэс не павінен страціць у якасці, але выконвацца ён будзе меншай колькасцю занятых. Пры гэтым выдаткі на адукацыю не павінны змяншацца, а памеры заробкаў павінны расці»

Спецыяльнага адбору ў такія класы мы пакуль не практыкуем. Усе, хто жадаў вывучаць вучэбныя прадметы на павышаным узроўні, былі залічаны. Але неабходна зразумець, што проста «адсядзецца» ў такім класе не атрымаецца. Заданні на выпускных экзаменах у 11-м класе па вучэбных прадметах, што вывучаліся на павышаным узроўні, будуць больш складаныя, чым для навучэнцаў, якія засвойвалі тыя ж прадметы на базавым узроўні.

Вераніка, г. Мінск:

— Я выпускніца Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва. Ведаю, што сёлета былі недаборы ў прыватныя ВНУ. І ў маім інстытуце ўжо другі ці нават трэці год запар не набіраюць абітурыентаў на спецыяльнасць «журналістыка». Але я асабіста задаволеная атрыманай адукацыяй — не думаю, што нас рыхтавалі горш, чым у Інстытуце журналістыкі БДУ. А кошт навучання быў ніжэйшы, чым у Белдзяржуніверсітэце. Заўсёды цікавіла, чаму? Хацелася б пачуць вашу думку: ці ёсць у прыватных ВНУ будучыня? А можа, усе прыватныя інстытуты чакае лёс «Энвілы»? І ці варта моладзі ўвогуле туды паступаць?

— Змяншэнне колькасці выпускнікоў і павышэнне мінімальнага бала на ЦТ адбілася не толькі на ўкамплектаванні прыватных, але і на запаўненні месцаў у дзяржаўных ВНУ, у тым ліку бюджэтных. Але, закрываць прыватныя інстытуты ніхто не будзе, калі, безумоўна, якасць адукацыі, якую там даюць, будзе на належным узроўні. Вы ж самі кажаце, што вашы веды — не горшыя, чым тыя, што даюць у Інстытуце журналістыкі. Іншая справа, што рашэнне аб спыненні сваёй дзейнасці можа прыняць заснавальнік установы адукацыі, калі дзейнасць інстытута стане нерэнтабельнай: калі ў інстытуце не змогуць набраць неабходную колькасць студэнтаў, каб арганізаваць навучальны працэс і заплаціць заробкі выкладчыкам. Да таго ж мы будзем павышаць патрабаванні да тых, хто паступае: бал, які дазволіць удзельнічаць у конкурсе, будзе і далей павышацца, а значыць, колькасць абітурыентаў, якія змогуць прэтэндаваць на атрыманне вышэйшай адукацыі, будзе яшчэ меншай. Таму, каб застацца на плаву, недзяржаўным установам вышэйшай адукацыі, напэўна, трэба будзе перагледзець пералік спецыяльнасцяў, па якіх вядзецца падрыхтоўка студэнтаў. Нельга рабіць стаўку толькі на эканамічныя спецыяльнасці і юрыспрудэнцыю.

Што тычыцца розніцы ў кошце навучання, то ён залежыць ад многіх фактараў: ад выдаткаў па выплаце заработнай платы выкладчыкам і іншым работнікам установы адукацыі, выдаткаў на практыку, аплату камунальных паслуг і гэтак далей. Калі ў БДУ працуе больш выкладчыкаў з навуковымі ступенямі і званнямі, адпаведна, там і больш высокія выдаткі па артыкуле «заробкі». І кошт навучання для студэнтаў платнай формы навучання таксама больш высокі.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

■ На парадку дня

ПАЙШЛІ Ў ШКОЛУ. НЕ БЫЛО Б БЯДЫ...

Пракурорскія работнікі ў выніку маніторынгу зрабілі высновy, што на тэрыторыі не ўсіх школ Віцебскай вобласці зроблена ўсё неабходнае, каб дзеці там былі ў поўнай бяспецы.

У прыватнасці, пры абследаванні школы ў Бешанковіцкім раёне ўстаноўлена, што ўчастак, прылеглы да ганка школы, не адгароджаны ад праезнай часткі дарогі. Адсутнічаюць спецыяльныя папераджальныя знакі. У школе не было супрацьпажарнай сігналізацыі.

У Верхнядзвінскім раёне тэрыторыі дзвюх школ агароджаны не па ўсім перыметры, недастаткова асветлены, адсутнічаюць пешаходны пераход і дарожныя знакі. У Докшыцкім раёне ўстанавілі выпадкі неабсталявання школ аўтаматычнай пажарнай сігналізацыяй і сістэмай апавяшчэння аб пажары. У дзвюх школах Ушацкага раёна ўмовы для бяспечнага пераходу дарогі каля іх не створаны. Школы ж знаходзяцца блізка ад аўтадарог, а пешаходныя пераходы і штучныя няроўнасці для паніжэння хуткасці аўтатранспарту на асфальце адсутнічалі. Мелі выпадкі недастатковага асвятлення дарог паблізу школ Шумілінскага раёна. Гэтыя прыклады прывёў **Антон ВОЛКАЎ, старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб непаўналетніх і моладзі**.

Усяго пракурорамі з мэтай ліквідацыі выяўленых парушэнняў унесена ўстановам адукацыі восем прадстаўленняў, вынесена 17 прадпісанняў. Адначасова пракурорскімі работнікамі была праведзена і пэўная асветніцкая праца: Яны выступалі больш за 70 разоў, у тым ліку і на бацькоўскіх сходах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

Конкурсный управляющий ЧПТУП «Белэкомебель» Е.А. Кудренок – организатор торгов, извещает о проведении 18 ноября 2013 г. в 10.40 по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8-25 открытых торгов в форме аукциона (на повыш. нач. цены) по продаже имущества, шаг торгов – 5 % от первоначальной стоимости, задаток – 10% от первоначальной стоимости:

№ п/п	Наименование лотов	Кол-во	Ед. изм.	Цена за ед., руб.	Стоимость, руб. (без НДС)
1	Компьютер P-IV	1	шт.	836 000	836 000
2	Принтер «Samsung ML 1610»	1	шт.	565 910	565 910
3	Вешалка выдвижная L-450 мм	4	шт.	5 680	22 720
4	Детали СПА 3390 6,2 м 9	7,22	пог.м.	9 060	65 413
5	Детали СПА 3391 6,2 м 9	7,2	пог.м.	3 710	26 712
6	Детали СПА 3393 6,2 м 9	7,22	пог.м.	7 020	50 684
7	Детали СПА 3394 6,2 м 9	7,22	пог.м.	3 440	24 837
8	Заглушка ПВХ к конфирмату	0,1	1000 шт	48 340	4 834
9	Защелка магнитная № 2 (58 мм) бел.	27	шт.	2 050	55 350
10	Зеркало 4 мм бронза 1605*2550 мм	2	м.кв.	91 430	182 860
11	Конфирмат 7*70	0,5	1000 шт	193 710	96 855
12	Кромка ПВХ 05\4 ольха, махонь, яблоня, лимба 2\22	240	пог.м.	2 140	513 600
13	Кромка ПВХ 18\1 венге магия 2\42	40	пог.м.	5 280	211 200
14	Кромка ПВХ 19\2 венге светлое 1\22	60	пог.м.	1 360	81 600
15	Кромка ПВХ 20\2 макассар цейлон, зебрано африканское 2\22	185	пог.м.	2 140	395 900
16	Кромка ПВХ 23\1 слива, белая 2\42	150	пог.м.	5 280	792 000
17	Кромка ПВХ 51S черный 1/22, 60В крем 1\22	90	пог.м.	1 050	94 500
18	Кромка ПВХ 63В фисташка, алюминий, ваниль 2\22	238,4	пог.м.	2 110	503 024
19	Кромка ПВХ № 033 W 23/0,8 мм	5,7	пог.м.	740	4 218
20	Кромка ПВХ № 14456 45/2,0 мм бежевая, ваниль	185	пог.м.	5 280	976 800
21	Кромка ПВХ № 5753 0,8/22 мм орех темный	21	пог.м.	820	17 220
22	Кромка ПВХ № 7024 23/0,8 мм	7,5	пог.м.	740	5 550
23	Кромка ПВХ № 7731 23/2,0 мм	37,64	пог.м.	2 110	79 425
24	Кромка ПВХ № 9984 22/2,0 мм клен св.	194,7	пог.м.	2 140	416 551
25	Пропуск для кабеля	19	шт.	950	18 050
26	Профиль алюм экструд. соединител. шампань 6.0 м	14,99	пог.м.	13 440	201 519
27	Профиль алюмин. направляющая низ шампань 6,0 м	15	пог.м.	16 270	244 050
28	Профиль алюмин.экструд. напр. верх золото 5,8 м	16	пог.м.	27 460	439 360
29	Профиль алюмин.экструд. напр. нижн. золото 5,8 м	16	пог.м.	14 930	238 880
30	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	20,9	пог.м.	25 440	531 696
31	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	32,5	пог.м.	26 650	866 125
32	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	17,1	пог.м.	25 940	443 574
33	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	123,8	пог.м.	23 070	2 854 913
34	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	15	пог.м.	11 690	175 350
35	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	41	пог.м.	11 890	487 490
36	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	18,1	пог.м.	12 400	224 440
37	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	29,4	пог.м.	36 420	1 070 748
38	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	64,6	пог.м.	37 970	2 452 862
39	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	28,3	пог.м.	38 440	1 087 852
40	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	20,1	пог.м.	15 670	314 967
41	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	19,3	пог.м.	16 270	314 011
42	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	25,3	пог.м.	17 010	430 353
43	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	31,9	пог.м.	16 480	525 712
44	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	53	пог.м.	21 650	1 147 450
45	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	90,55	пог.м.	22 370	2 025 604
46	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	23	пог.м.	22 780	523 940
47	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	27,2	пог.м.	13 610	370 192
48	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	50	пог.м.	10 840	542 000
49	Профиль алюминиевый экструдированный AYPC	45	пог.м.	11 090	499 050
50	Саморезы для креп. г. пл. к дер. обр. 3,5*55 4000 шт	0,6	тыс.шт.	46 510	27 906
51	Саморезы для креп. Гипс. плит к дер. обр. 4,8*150	0,2	тыс.шт.	241 300	48 260
52	Шуруп по дер., ДВП, ДСП желтопассир. 5,0*70	0,65	тыс.шт.	105 780	68 757
53	Шуруп по дер., ДВП, ДСП желтопассир.5,0*80	0,55	тыс.шт.	112 540	61 897
	ИТОГО:				24 260 770

Прием заявок по адресу проведения торгов с даты настоящей публикации **до 16.11.2013 г. с 9.00 до 18.00**, здесь же ознакомление с составом лота и др. сведениями, формой заявки, договором и др. документами. Тел. в Минске: 8-029-644-38-92. Оплата производится с даты настоящей публикации до 14.11.2013 г. на р/с 3012006533000 в РКЦ № 1 ЗАО «БелСвиссБанк», код 175, УНП 190726444.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в теч. 3 раб. дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в теч. 5 календ. дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в теч. 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

■ Спорт-тайм

ГАНЧАРЭНКА ЎЗНАЧАЛІЎ КРАСНАДАРСКУЮ «КУБАНЬ»

Фота fckuban.ru

Нечаканая навіна. Інакш і не назавеш пераезд экс-настаўніка барысаўскага БАТЭ ў Краснадар. Спартыўны аглядальнік «Звязды» вылучае гэтую падзею сярод астатніх і лічыць галоўнай у айчыннym футболе.

1. Праўда, пачнем наш традыцыйны агляд спартыўнага жыцця краіны навіной пра нашу нацыянальную футбольную зборную. Падапечныя Георгія Кандрацьева завяршылі выступленне ў адборачным турніры да чэмпіянату свету, які ў наступным годзе прыме Бразілія. Завяршаць адбор прыйшлося гасцявым матчам з іспанцамі. Разлічваць на перамогу ў горадзе Пальма нашым суайчыннікам было складана, аднак даць бой «чырвонай фурыі» яны паспрабавалі. У выніку гаспадары перамаглі з лікам 2:1. Адзіны гол у беларусаў на свой рахунак запісаў Сяргей Карніленка. «Каб паспяхова згуляць з іспанцамі, трэба выключыць памылкі, — адзначыў Георгій Кандрацьеў, галоўны трэнер зборнай Беларусі. — На жаль, зрабіць гэта ў нас не атрымалася, хаця вялікіх прэтэнзій да хлопцаў не маю. Кваліфікацыю беларусы скончылі на апошнім радку групы «І». Пры гэтым зборныя Іспаніі, Францыі, Фінляндыі і Грузіі правядуць яшчэ па адной сустрэчы. У сваю чаргу, беларусы сёння ў таварыскім матчы згуляюць супраць Японіі. Пра гэты паядынак чытайце ў асобным артыкуле сённяшнага нумара «Звязды».

2. Хакейнае «Дынама» правяло яшчэ два паядынкі ў Кантынентальнай хакейнай лізе. І калі маскоўскі «Спартак» мінчане перамаглі з лікам 3:1, спатканне з данецкім «Данбасам» не прынесла «зубрам» прыемных эмоцый (2:4). Цяпер мінчане рыхтуюцца да выязной серыі, якая распачнецца 17 кастрычніка паядынкам у Чэхаве з мясцовым «Віцязем».

3. Уладзімір Самсонаў заваяваў сярэбраны медаль на чэмпіянаце Еўропы па настольным тэнісе. Славуты беларус, між іншым, трохразовы пераможца кантынентальнага першынства ў адзіночным разрадзе, у фінальнай сустрэчы не здолеў супрацьстаяць на роўных нямецкаму тэнісісту Дзмітрыю Аўчарову (0:4). Як кажуць, маладосць перамагла вопыт: Аўчароў на 12 гадоў маладзейшы за Самсонава.

4. У жаночым розыгрышы Кубка Кубкаў па гандболе жаночы БНТУ-БелАЗ двойчы перайграў турэцкі «Юскюдар» (41:22, 36:21) і прабіўся ў 1/16 фіналу, дзе сустрэнецца з дацкім клубам «Хольстэбро». Выдатна ў гасцявой сустрэчы з партугальскім клубам «Калегія Жуаў дэ Баруш» дзейнічала каманда «Гомель» (23:26). Нагадаем, што ў першым матчы гамяльчанкі таксама атрымалі вікторыю з лікам 24:40. У наступным раўндзе нашых суайчыннiц чакае іспанская «Гран-Канарыя». Свой першы матч «БГК імя Мяшкова» ў мужчынскім розыгрышы Кубка ЕГФ перайгралі «Пермскія мядзведзі» (30:26). Матч у адказ адбудзецца 19 кастрычніка ў Брэсце.

5. Яшчэ ў мінулыя выхадныя Віктар Ганчарэнка трэніраваў барысаўскі БАТЭ, а ўжо праз некалькі дзён атрымаў прапанову ўзначаліць краснадарскую «Кубань». Перамовы паміж Ганчарэнкам, які 6 гадоў узначальваў барысаўскі клуб, прывялі да падпісання кантракта на 4,5 года. Віктар Ганчарэнка пачаў трэніраваць новы калектыў, які пакуль займае 10 радок расійскай прэм'ер-лігі, выступае ў Лізе Еўропы. Дапамагаць у працы з новай камандай яму будзе беларус Віктар Скрыпчанка, былы трэнер ФК «Мінск». Новым коўчам БАТЭ стаў Аляксандр Ермаковіч, які апошнім часам дапамагаў Ганчарэнку ў рабоце з асноўным складам гэтай каманды.

Тарас ШЧЫРЫ

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской территориальный фонд государственного имущества

извещает о проведении открытого аукциона по продаже объекта государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества (далее – аукцион) 18 ноября 2013 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. (017) 200 20 89.

На аукцион выставляется:

Сведения о предмете аукциона	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (учебный корпус) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, ул. Павловского, д. 58
Начальная цена предмета аукциона	7 577 397 577 белорусских рублей (в том числе: начальная цена недвижимого имущества – 7 348 942 297 белорусских рублей, начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 228 455 280 белорусских рублей)
Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	1 515 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе**
Продавец недвижимого имущества	Государственное учреждение «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», 220031, г. Минск, ул. Основателей, 24 конт. тел.: 8 (017) 266 52 33; 266 84 55
Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества	Общая площадь – 0,1478 га; вид вещного права – право аренды земельного участка, срок аренды – 5 лет
Характеристика недвижимого имущества	Общая площадь – 6400,2 кв.м, количество этажей – 6; строительство начато в 1990 году и не осуществляется с 1993 года; стены – железобетонные панели, кирпичные; перекрытия – железобетонные плиты; перегородки – железобетонные, частично – кирпичные; степень готовности объекта – 44%
Условия использования земельного участка	В соответствии с утвержденной градостроительной документацией – для дальнейшего использования объекта под научно-образовательное учреждение Государственному учреждению «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» обеспечить проезд транспортных средств победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона к незавершенному незаконсервированному капитальному строению (учебный корпус)
Условия по продаже недвижимого имущества	Сохранение функционального назначения объекта – научно-образовательное учреждение*

* Принять к сведению, что в соответствии с генеральным планом г. Минска объект расположен в зоне специального назначения, где не допускается изменение вида использования территории такого типа без соответствующих градостроительных обоснований и регламентов, разрабатываемых и утверждаемых в установленном порядке в градостроительных проектах детального планирования.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 15 ноября 2013 г. включительно.

К участию в аукционе допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), консолидированные участники (два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в аукционе, следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По заявлению победителя аукциона (претендента на покупку) Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка. Указанное заявление подается победителем аукциона (претендентом на покупку) в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона (далее – протокол). Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка принимается Минским горисполкомом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется в порядке, установленном решением Минского горисполкома от 30.04.2009 № 1015 «Об утверждении Инструкции о порядке внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским горисполкомом) за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий и предоставления организатору аукциона, продавцу и в Минский горисполком копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества. В тот же срок Минский горисполком передает победителю аукциона (претенденту на покупку) выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставл

НАВОШТА «ФУТРЫ» ЦАГЛЯНЫМ ДАМАМ?

Гэта і іншыя нестандартныя пытанні падчас «прамой лініі» ў Віцебскім гарвыканкаме пачуў Ігар МАРШАЛАЎ, намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю — дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў. На сваю пасаду ён быў прызначаны сёлета ў жніўні. Віцебск стаў першым з абласных цэнтраў, дзе Ігар Маршалаў выслухоўваў людзей па тэлефоне і прымаў асабіста.

Першым патэлефанаваў былы супрацоўнік МУС, які папрасіў паспрыяць... уладкаваць на працу ў Дэпартамент фінансавых расследаванняў сваю дачку — эканаміста па адукацыі.

Адным з самых эмацыянальных быў зварот жанчыны, якая падзялілася думкамі наконт уцяплення фасадаў цагляных дамоў. Маўляў, гэта ж эканамічна немэтазгодна, прычым «футры» дрэнна ўплываюць на здароўе людзей, якія жывуць у кватэрах, бо павышаецца тэмпература, а вільготнасць нікуды «не выходзіць». Калі ўжо так трэба, лепш уцяпляць панэльныя дамы, дзе людзі мерзнуць. Дарэчы, як адзначыла адна з адказных асоб, аналіз мер па ўцепленні дамоў насамрэч паказаў, што эканамічная выгада ад «футраў» мінімальная. А начальнік аддзела гарвыканкама, які адказвае за архітэктуру, у сваю чаргу, адзначыў, што «футры» на дамах ва ўсёй Беларусі з'яўляюцца. Чым Віцебск горшы?

На асабісты прыём прыйшла і Лілія Віктараўна з Віцебска. Яна не згодна з адмовай унітарнага прадпрыемства «Віцебскае аддзяленне Беларускай чыгункі» перадаць ёй ва ўласнасць кватэру, якую яна прыватызавала ў 2009 годзе. Кошт кватэры пагасіла, выплаціўшы за прыватызацыю 20 мільёнаў рублёў. Але цяпер патрабуюць яшчэ столькі ж. І тлумачаць гэта тым, што пры разліках памыліліся, указалі заніжаны кошт жылля. Свой промах чыгунка прызнае, але...

— Мне адказалі, што, калі не даплачу, анулююць прыватызацыю, і буду па-новаму прыватызаваць. Ці маюць яны рацыю? Куды толькі ні звярталася, ніхто мне не дапамог, — падзялілася бядой жанчына.

Падчас прыёму ёй параілі паспрабаваць абараніць свае правы ў абласным судзе, дзе дадуць ацэнку ўсім дакументам, яе довадам... Тым больш, што на чыгунцы прызнаюць сваю памылку.

Пенсіянерка з Віцебска 1,5 года пражывала ў пабудаванай 2-пакаёвай кватэры без рэгістрацыі. А ўсё таму, што пасля павелічэння кошту «квадрата» ёй неабходна даплаціць 40 мільёнаў рублёў. Высветлілася, што ў свой час яна прадала старую кватэру і пералічыла неабходную суму для будаўніцтва новай. Але, падпісваючы дамову на будаўніцтва, не звярнула ўвагу на запіс аб тым, што канчатковы кошт разлічваецца пасля ўводу жылля. І ў выніку атрымаўся вялікі доўг. Між іншым, у гарвыканкаме раней паспрабавалі вырашыць гэтую праблему: штомесяц пажылой жанчыне трэба выплачваць усяго па 200 тысяч рублёў. Але, паводле яе слоў, і гэтыя, у наш час невялікія, грошы для яе — значная сума.

— Вынеслі ў судзе рашэнне — прапісацца нам (з сынам. — **Аўт.**) у новай кватэры, а доўг, 40 мільёнаў, так і «цягнецца». Дапамажыце, каб з пенсіі грошай не вылічалі, паколькі пенсія невялікая і ў многім прыходзіцца сабе адмаўляць, — папрасіла пенсіянерка.

— Грамадзянам быў растлумачаны парадак існуючага заканадаўства. Шэраг пытанняў, якія датычыліся непасрэдна дзейнасці органаў фінансавых расследаванняў, будуць дадаткова праверацы. Іншыя пытанні ўжо разглядаюцца ў судзе. Астатнія перададзены на разгляд мясцовай уладзе, — сказаў прадстаўнікам СМІ Ігар Маршалаў, каментуючы вынікі прыёму грамадзян. — Калі закон на баку тых, хто звярнуўся, зробім усё, каб дапамагчы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Актуальнае пытанне

ХТО ЗДАЕ ШКЛАТАРУ? ТОЛЬКІ ЭНТУЗІЯСТЫ

У савецкія часы здача пустых бутэлек і слоікаў была нечым накшталт своеасаблівага законнага бізнесу, у якім удзельнічалі ўсе — і навучэнцы, і студэнты, і інтэлігенты, і рабочыя, і пенсіянеры. І не дзіўна: адна здадзеная паўлітровая бутэлька з-пад малака давала профіт у тры талончыкі на праезд. У часы, калі не было ні пластыкавай, ні поліэтыленавай тары, шкло цанілася. Тэхнічны прагрэс, дзякуючы якому з'явілася аднаразовая ўпакоўка, фактычна падпісаў шклу жорсткі прысуд. Як вынік, адзін за адным пачалі закрывацца пункты прыёму зваротнай тары... Ды вось толькі каму ад гэтага стала лепш?

Падчас адпачынку ў мяне з'явілася ідэя правесці ў кватэры своеасаблівую рэвізію, каб вызваліць крыху месца на балконе, дзе за год назбіралася старых непатрэбных шкляных слоікаў ды бутэлек. Але проста так іх выкідваць не хацелася. Па-першае, шматлікія бігборды экалагічнай скіраванасці заклікаюць да захоўвання прыродных рэсурсаў шляхам здачы другаснай сыравіны ў прыёмныя пункты. А па-другое, на гэтым можна крыху зарабіць. Грошы ж лішнімі не бываюць ніколі. Аднак справа аказалася няпростай.

ЗДАВАЦЬ СЛОІКІ І БУТЭЛЬКІ ВЫГАДНА. КАЛІ ЗДАЕШ ІХ СОТНЯМІ

У нас дома пасля сезона закатак засталося каля шасцідзесяці незапатрабаваных пустых слоікаў. І ў першым жа прыёмным пункце спасцігла расчараванне. Побач з акном прыёмшчыка вісеў вялікі аркуш паперы з надпісам тлустымі літарамі: «Слоікі не прымаем. Увогуле».

— Не так шмат нам здаюць шклатары, — гаворыць прыёмшчык Аляксей. — Наш звычайны кантынгент вы бачылі на ўваходзе. Заможнымі гэтых людзей назваць немагчыма, яны хапаюцца за любую капейку. А маладыя людзі ўвогуле завітваюць вельмі рэдка. Вы — першы за апошнія два тыдні. Няма зараз у людзей вялікага фінансавага стымулу здаваць шклатару. У савецкі час вы атрымалі б за пяць здадзеных літровых бутэлек рубель, за які змаглі б набыць 25 талончыкаў на тралейбус... А слоікі мы перасталі прымаць яшчэ год таму. Нявыгадна нам гэта...

Сапраўды, дзе ж узяць той фінансавы стымул, калі за пяць бутэлек прыёмшчык уручыў мне аж... тысячу рублёў. Іду і думаю: што ж на іх набыць. Хіба што тры пачкі запалак? Альбо самы танны стрыжань для шарыкавай ручкі? Дык не дзіўна, што бутэлькі прасцей выкінуць у кантэйнер, чым цягнуць крохкі груз на сабе, атрымліваючы за яго нейкія капейкі...

Яшчэ складаней з непатрэбнымі слоікамі. Абабіўшы парогі чатырох прыёмных пунктаў, высветліў, што тару з-пад садавіны гатовы прыняць толькі ў адной кропцы, і толькі на бой. Як ні дзіўна, гэтую кропку дапамаглі знайсці мясцовыя выпівохі. Размяшчаецца вышэйзгаданы пункт у сарака хвілінах хады ад дома. Калі ж пад'ехаць да яго на аўтобусе, то ўсё роўна потым трэба прайсці больш за кіламетр з крохкім грузам у руках. Крокавай даступнасцю тут і не патыхае: ну які чалавек пацягне шклатару ў такую далеч?

А цяпер возьмем у рукі калькулятар. За кілаграм слоікаў, здадзеных на шклабой, паабяцалі 300 рублёў. У такую далеч з імі не пойдзеш і ў перапоўнены аўтобус не ўлезеш — трэба ехаць на аўто. Калі падлічыць выдаткі на паліва ды невялічкі

— Зараз у Мінску тару бяруць 27 нашых стацыянарных пунктаў прыёму другаснай сыравіны і два перасоўныя, — гаворыць начальнік эксперыментальнага цэха другаснай прадукцыі КУП па абыходжанні з адходамі «Экарэс» Эдуард Надзіеўскі. — Усяго ж мы за год нарыхтоўваем прыкладна 3,5 тысячы тон бою. У асноўным гэта, як правіла, бутэлькі, слоікі

У беларускай сталіцы нарыхтоўкай шкла займаюцца зараз 9 арганізацый. Аднак колькасць прыёмных пунктаў пастаянна скарачаецца з-за нерэнтабельнасці.

«Складваецца парадаксальная сітуацыя: танней купіць сыравіну для вытворчасці шклатары з нуля, чым перапрацоўваць тое, што ўжо маем...»

прыз у якасці двухсот грамаў цукерак, то атрымліваецца, што трэба здаць за раз... ледзь не цэнтнер тары. Пусты паўлітровы слоік важыць прыкладна 250 грамаў. Цікава, хто з нас мае дома трыста-чатырыста непатрэбных ёмістасцяў?

Пенсіянерка Ганна Іванова — адна з нямногіх энтузіястак, якая ўсё ж прынесла з сабой пустыя шкляныя бутэлькі. Кажа, што яны ўсе з-пад імпартных напояў і таму іх можна пусціць толькі на бой.

— Колькі тут іх? Дзесяць штук назбіралася. Гэта значыць, дзве тысячы дадуць. Ну хоць на чацвярцінку хлеба хопіць, — падлічвае бабулька. — А вось трыццаць гадоў таму ўсё было інакш. Я памятаю, як мая дачка вельмі проста зарабляла на марозіва: дзве здадзеныя паўлітровыя бутэлькі з-пад малака — адна порцыя.

ЗДАЧА ШКЛАТАРЫ Ў МІНСКУ...

У беларускай сталіцы сёння працуюць дзевяць нарыхтоўчых арганізацый, кожная з якіх валодае ўласнай сеткай прыёму.

Тэндэнцыя, на жаль, засмучальная: колькасць прыёмных пунктаў увесь час скарачаецца. Карані гэтага трэба шукаць у нерэнтабельнасці іх дзейнасці. Нават пры існуючых тарыфах мы працуем са стратамі. Таму плаціць больш за 400 рублёў за кілаграм шклабою не маем магчымасці. А кошт яго рэалізацыі перапрацоўчым арганізацыям яшчэ больш нізкі — такую ўмову дыктуе рынак. Не трэба забывацца на значныя транспартныя выдаткі: цяпер літр паліва каштуе не 10 капеек. Са зваротнай шклатарай праблем яшчэ больш. Яе трэба належным чынам упакаваць, каб яна не пабілася ў дарозе, пасля памыць... І, вядома ж, запляціць усім грошы за зробленую працу.

У савецкія часы здачу шклатары адносна аблягчала тое, што слоікі і бутэлькі выпускаліся па стандартах, адзіных для ўсёй дзяржавы. Цяпер жа такой практыкі не існуе, і таму многія замежныя прадпрыемствы перайшлі на выпуск прадукцыі ў эксклюзіўнай тары. Вядома, для маркетынгу гэта ход добры: спецыфічныя банкі і бутэлькі выглядаюць незвычайна, і верагоднасць таго, што прадукцыю ў іх набудуць, узрастае. Да гэтага трэба дадаць і галасаванне пакупнікоў рублём — у гіпермаркетах кансерваваная садавіна імпартнага паходжання каштуе часам танней за айчынную. А вось везці пустыя слоікі з-пад яе з Беларусі назад у чымасць здаць пустую тару адразу ў магазіне — як кажуць, не адыходзячы ад касы, што, напрыклад, паспяхова прыжылося ў Швецыі і іншых краінах Захаду. Але ўзнікае іншае пытанне: ці пагодзяцца на гэта буйныя гандлёвыя сеткі і простыя дробныя крамы? Усё-такі яны нацэлены на як мага большае атрыманне прыбытку. А як паказвае практыка, нарыхтоўчы бізнес вялікай выгады не прыносіць...

— Складваецца парадаксальная сітуацыя: танней купіць сыравіну для вытворчасці шклатары з нуля, чым перапрацоўваць тое, што ўжо маем. І гэта пры тым, што некаторыя кампаненты (напрыклад, кальцыніраваная сода) набываюцца ў суседніх краінах за валюту. Мы ж выдаткоўваем на закупку шкла ад насельніцтва і юрыдычных асоб больш грошай, чым пасля атрымліваем, — працягвае Эдуард Надзіеўскі. — Зніжаць цяперашнія расцэнкі мы не можам, бо рызыкуем страціць такім чынам і апошніх прадстаўнікоў колішняй арміі здатчыкаў другаснай сыравіны...

...І ЗА МЯЖОЙ

— Калі я ездзіў у камандзіроўку ў Берлін, то звярнуў увагу на тое, што ў буйных гандлёвых цэнтрах Германіі дзейнічае аўтаматызаваны спосаб прыёму шклатары, — гаворыць інжынер Аляксей. — Напрыклад, мне аўтамат быў гатовы выдаць за здадзеную бутэльку 12 еўрацэнтаў. Але можна, напрыклад, грошы не забіраць, а атрымаць за іх талон, з дапамогай якога аплаціць частку новай пакупкі. Ці ахвяраваць атрыманую суму на абеды бяздомным...

ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

Вось і атрымліваецца, што шклатару зараз здаюць у прыёмныя пункты пераважна людзі пажылога ўзросту, якія робяць гэта, як калісьці ў савецкі час, ды тыя, каму не хапае на чарговую порцыю алкаголю. Таму калі вы сустрэнеце ў натоўпе ці грамадскім транспарце кволую пенсіянерку ў патрапаным старым адзенні, якая цягне з сабой пакет, з якога даносіцца звон пустых бутэлек, не пагарджайце ёй. Бо яна, па сутнасці, адна з добраахвотных санітараў горада, чыімі стараннямі ён становіцца крыху чысцейшы.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■

АКЦЫІ — З АУКЦЫЁНАЎ

Дзяржаўны камітэт па маёмасці Беларусі абвясціў аб правядзенні мерапрыемстваў па продажы акцый (доляў) акцыянерных (гаспадарчых) таварыстваў і прадпрыемстваў як маёмасных комплексаў. У падрыхтаваным пераліку — 85 прадпрыемстваў, інфармацыя аб якіх размешчана на сайце Дзяржкамаёмасці.

На аўкцыёнах інвестарам прапануюць акцыі 50 прадпрыемстваў. Яшчэ 33 акцыянерныя таварыствы будуць прадаваць свае каштоўныя паперы паводле конкурсу. Як маёмасныя комплексы прадаюцца два прадпрыемствы.

З аўкцыёну, напрыклад, плануецца прадаць долі дзяржавы ў статутным фондзе СЗАТ «Шклозавод Ялізава» (Асіповіцкі раён), завода «Эвістар» (г. Віцебск), акцыянернага таварыства «Віцебскі прыборабудаўнічы завод», Брэсцкага радыётэхнічнага завода, АТ «Івацэвічыдрэў», Віцебскага плодаагародніннага камбіната і шэрагу іншых прадпрыемстваў Мінпрама, Мінэнерга, Мінтранса, Мінсельгасхарча, канцэрнаў «Белдзяржхарчпрам» і «Белеспаперапрам».

Паводле конкурсу будуць прадаваць акцыі таварыства «Мазырскі НПЗ», Беларускага марскога параходства, Гомельскага радыёзавода, прадпрыемства «Прамсувязь», кіруючай кампаніі холдынга «Гарызонт», авіякампаніі «Трансавіяэкспарт», таварыства «БАТЭ — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты», Мінскага завода ацяпляльнага абсталявання і іншыя.

Адзіным маёмасным комплексам прапануецца прадаць на аўкцыёне прадпрыемства «Бярозатара» і вытворчае прадпрыемства «Экзон-Глюкоза» (г. Драгічын) .

Продаж дзяржакцый акцыянерных таварыстваў ажыццяўляецца паводле рашэння кіраўніка дзяржавы.

У Дзяржкамітэце па маёмасці ўдакладнілі, што набываць акцыі маюць права фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, юрыдычныя асобы рэспублікі, за выключэннем дзяржаўных арганізацый і гаспадарчых таварыстваў, у статутных фондах якіх колькасць дзяржакцый перавышае 50%. Акцыі на аўкцыёнах могуць купляць замежныя дзяржавы і іх адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, міжнародныя арганізацыі, замежныя юрыдычныя асобы, а таксама замежныя арганізацыі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі.

Пачатковая цана продажу акцый вызначаецца па найбольшай з іх рынкавай або балансавай цане па стане на 1 студзеня года продажу гэтых каштоўных папер. Рынкавая ацэнка акцый ажыццяўляецца пасля прыняцця рашэння Прэзідэнта аб іх продажы.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Праекты

ЁСЦЬ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ

Будзе створаны беларуска-ізраільскі аграпрамтэхнапарк

Маленькі па плошчы Ізраіль дзякуючы Беларусі зможа значна пашырыць плошчы аграрнага прызначэння.

У ізраільскім Міністэрстве сельскай гаспадаркі гатовы падтрымаць ідэю рэалізацыі сумеснага праекта па стварэнні ў Віцебскай вобласці беларуска-ізраільскага аграпрамтэхнапарка. Тут плануецца вырошчванне экалагічна чыстай сельскагаспадарчай прадукцыі, развядзенне буйной рагатай жывёлы, адкрыццё міжнародных незалежных сертыфікацыйных цэнтраў і нават атрыманне біялагічна актыўнага мёду для адпраўкі на экспарт.

— У Ізраіля ёсць зацікаўленасць у тым, каб прыйсці на рынак Беларусі з новымі тэхналогіямі. Нас жа цікавіць павялічэнне экспарту нашай прадукцыі на рынкі Еўрапейскага саюза, Ізраіля, ЗША і гэтак далей, — расказвае **Ігар ВОЙТАЎ, старшыня дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь**.

Паводле яго слоў, ужо ёсць канкрэтныя прапановы ізраільскага боку аб выпуску новых тыпаў кармоў — высокаэфектыўных, з прапарваннем, бяспечных з пункту гледжання вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. Таксама абмяркоўваюцца пытанні, звязаныя са стварэннем у Беларусі пчалярскіх гаспадарак з наступным экспартам у Ізраіль біялагічна актыўнага мёду.

Вядома, што Ізраіль вырабляе шмат прадукцыі з розных відаў лекавай сыравіны, таму існуе вялікая цікавасць да карысных раслін і дароў лесу, якіх шмат у Беларусі.

На тэрыторыі будучага парка ўжо выказалі жаданне таксама распачаць бізнес фірмы з ЗША, Германіі, Расіі. Амерыканцы прапануюць рэалізаваць праект па лакальным забеспячэнні аб'ектаў сельскай гаспадаркі энергетыкай. А немцы плануюць на тэрыторыі парка ўкараніць новую тэхналогію вытворчасці дамоў сельскагаспадарчага прызначэння па нізкім сабекошце.

Яір ШАМІР, міністр сельскай гаспадаркі і развіцця вёскі Ізраіля, упэўнены, што ў сумесназа міждзяржаўнага праекта ёсць шанц быць паспяхова рэалізаваным практычна на 100%.

— Перш за ўсё трэба ўдакладніць падрабязнасці гэтага праекта і прывесці ў адпаведнасць з чаканнямі абодвух бакоў. Каб у выніку не было непаладак, і абодва бакі разумелі, чаго яны хочуць дасягнуць і да чаго яны могуць прыйсці. Інтуіцыя мне падказвае, што такі праект будзе эфектыўным, — сказаў міністр.

Паводле яго слоў, інтарэс Ізраіля даволі зразумелы. Па тэрыторыі краіна маленькая — у дзясяткі разоў менш за Беларусь, а палова плошчы Ізраіля — пустыня.

— Таму, развіваючы супрацоўніцтва з вашай краінай у галіне сельскай гаспадаркі, мы таксама будзем мець эканамічную выгаду і пашырым сваю працу ў навуковым сектары.

У нашым супрацоўніцтве мы на самой справе дапаўняем адзін аднаго. Мы можам прывесці новыя тэхналогіі і скарыстацца тэрыторыямі і прыроднымі рэсурсамі вашай краіны, — дадаў Яір Шамір.

Інвестары на тэрыторыі аграпрамтэхнапарка змогуць атрымаць значныя падатковыя і іншыя прэферэнцыі. Па папярэдніх падліках спецыялістаў, калі праект будзе рэалізаваны, у бліжэйшыя гады памер інвестыцый дасягне 2,5 мільярда долараў. Працу атрымаюць больш як 7 тысяч чалавек, а сярэдні штомесячны заробак працаўнікоў будзе на ўзроўні 1,1 тысячы долараў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

■ Факт

СТАЛІЧНЫЯ ЛЖЭПРАДПРЫМАЛЬНІКІ НЕ ЗАПЛАЦІЛІ ДЗЯРЖАВЕ БОЛЬШ ЗА 1 млрд рублёў ПАДАТКАЎ

Супрацоўнікамі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС Беларусі затрымалі мінскіх ілжэпрадпрымальнікаў, якія без намеру ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць пераводзілі ў гатоўку грашовыя сродкі суб'ектаў гаспадарання. «Шэрая» фінансавая гульня махінатараў прычыніла ўрон дзяржаве ў выглядзе нявыплаты падаткаў у памеры больш за 1 млрд рублёў, паведаміла рэдакцыі старшая оперупаўнаважаная па асабліва важных справах ГУБЭЗ МУС Беларусі Вераніка Пасмеццева.

Аператыўнікамі было выяўлена, што 57-гадовы жыхар Мінскага раёна стварыў злачынную групу, якая пасля рэалізацыі канцтавараў і іншай прадукцыі дзяржарганізацыям па загадзя прадуманай схеме выводзіла грашовыя сродкі з легальнага абарачэння праз ілжэпрадпрымальнікаў. Пры гэтым падаткаў дзяржаве ніхто не плаціў.

Арганізатар зарэгістраваў шэраг падканрольных яму суб'ектаў гаспадарання, якія пераводзілі безнаяўныя грашовыя сродкі ў наяўныя праз індывідуальных прадпрымальнікаў, а апошнія канвертавалі рублі ў долары. Такі «бізнес» стаў маштабным: толькі адзін удзельнік злачыннай групы, 30-гадовы індывідуальны прадпрымальнік за чатыры месяцы (сёлета з лютага па верасень) перавёў у гатоўку каля 6 млрд рублёў і набыў больш за 600 тысяч долараў.

Упраўленнем Следчага камітэта па г. Мінску ў дачыненні да індывідуальнага прадпрымальніка завялі крымінальную справу за лжэпрадпрымальніцтва, якое пацягнула прычыненне шкоды ў асабліва буйным памеры. У выніку праведзеных аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і вобыскаў у падазраванага і яго каманды аператыўнікі канфіскавалі больш за 100 тысяч долараў і каштоўнасці, якія знаходзіліся па месцы жыхарства і ў банкаўскай ячэйцы, таварна-транспартныя накладныя і іншыя дакументы. Выяўлены дарагія аб'екты нерухомасці і аўтамабілі, якія з мэтай утойвання прыроды паходжання рэгіструваліся на трэціх асоб. За такое лжэпрадпрымальніцтва, што пацягнула прычыненне дзяржаве ўрону ў асабліва буйным памеры, прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Сяргей КУРКАЧ.

ГАНДЛЯВАЎ НЕІСНУЮЧАЙ ПАРТЫЯЙ МЯСА

Міліцыянеры затрымалі падазраванага ў махлярстве «прадпрымальніка», які гандляваў неіснуючай партыяй ялавічыны. Тым не менш за «ўзятыя са столі» 20 тон мяса ён папрасіў у пакупнікоў з Расіі 60 тысяч долараў.

— Затрыманы на працягу некалькіх гадоў займаўся дробным рознічным гандлем. План разбагацець узнік у яго пасля таго, як малады чалавек пазнаёміўся з індывідуальнымі прадпрымальнікамі з Расіі, якія прыехалі да нас у пошуках партыі мясной прадукцыі па выгадных цэнах. Наш герой заявіў расіянам, што з'яўляецца... аптовым пастаўшчыком мяса ў Расію і ва Украіну. Больш за тое, зрабіў прапанову, ад якой, як той казаў, немагчыма было адмовіцца, — паведаміла прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г.Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Да наступнай сустрэчы махляр падрыхтаваўся: падрабязна пракансультаваўся з адным са сваіх знаёмых, які насамрэч займаўся гандлем у гэтай сферы. Потым правёў некалькі сустрэч ужо з «патэнцыяльнымі» пакупнікамі. Нарэшце «прадавец» прызначыў чарговую — каля аднаго з дамоў па вуліцы Алега Кашавога, дзе ён быццам бы пражываў. Выйшаўшы з пад'езда, махляр перадаў расіянам ксеракопію пашпарта, на зваротным баку якой напісаў распіску ў атрыманні перадаплаты ў памеры 18 тысяч долараў за пастаўку партыі ялавічыны. Атрымаўшы грошы, «прадавец» сказаў, што аднясе грошы дадому і вернецца з пакетам неабходных дакументаў.

...Пакупнікі прачакалі «пастаўшчыка» каля пад'езда каля дзвюх гадзін. Тэлефон яго не адказваў. Потым высветлілася, што пад'езд меў яшчэ адзін выхад.

Падазраваны ў махлярстве быў затрыманы ў Оршы. Пры гэтым сілавую падтрымку аказалі супрацоўнікі АМАПа. Яна прыйшлася дарэчы, бо зламыснік аказаў актыўнае супраціўленне і спрабаваў уцячы. Як высветлілася пазней, з'яўленне супрацоўнікаў міліцыі было для махляра нечаканым: ён быў упэўнены ў тым, што ўсё вельмі старанна прадумаў. Бо, акрамя выбранага загадзя прахаднога пад'езда, «папрацаваў» на камп'ютары над уручанай «пакупнікам» ксеракопіяй пашпарта. Ён змяніў усю тэкставую інфармацыю ў адсканаванай старонцы, але забыўся памяняць... асабісты нумар. Гэтая акалічнасць і стала «зачэпкай» для аператыўнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ У новым фармаце

Электроннае правасуддзе: як і навошта?

Заканадаўства пакуль не паспявае за новымі тэхналогіямі

Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі сёння актыўна ўкараняюцца практычна ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Не застаецца ў баку ад гэтых рэалій і судавытворчасць, асабліва што датычыцца разгляду гаспадарчых спрэчак. Які ж досвед ужо напрацаваны і якія «бар'еры» стаяць на шляху ўкаранення элементаў электроннага правасуддзя? Гэта абмеркавалі прадстаўнікі 25 установ навукі і адукацыі, Канстытуцыйнага Суда і шэрагу іншых дзяржаўных органаў Беларусі, а таксама Расіі і Украіны падчас міжнароднага семінара.

— Дык што такое электроннае правасуддзе? — пацікавіліся мы ў **старшыні аргкамітэта першага ў нашай краіне навуковага форуму па тэме электроннага правасуддзя, загадчыка кафедры грамадзянскага права і працэсу ГрДУ імя Янкі Купалы, кандыдата юрыдычных навук Ігар МАРТЫНЕНКІ.**

— Гэта спосаб ажыццяўлення правасуддзя, заснаваны на выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій. Асноўныя складнікі гэтай сістэмы — падача дакументаў у суд у электронным выглядзе, прымяненне відэаканферэнц-сувязі пры разглядзе спраў, размяшчэнне ў інтэрнэце банка звестак судовых пастаноў і іншай інфармацыі аб дзейнасці судоў, магчымасць азнаямлення з матэрыяламі спраў пры дапамозе аддаленага доступу і г.д.

У чэрвені адбылося пасяджэнне Савета па пытаннях прававой і судовай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, дзе разглядалася пытанне аб канцэптуальных падыходах да прававога рэгулявання судавытворчасці ў электроннай форме. Канстатавалася, што ў краіне ёсць перадумовы для стварэння і развіцця сістэмы электроннага правасуддзя. На заканадаўчым узроўні замацаваны асноўныя прынцыпы і кірункі выкарыстання інфармацыйных камунікацыйных тэхналогій у дзейнасці дзяржаўных органаў.

— Дзе ў нашай краіне рэальна дзейнічае такая электронная сістэма?

— Найбольш актыўна яна сёння выкарыстоўваецца ў гаспадарчых судах. Старшыня гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці Валерый Касцюкевіч прывёў на семінары пераканаўчыя аргументы на карысць элементаў электроннага правасуддзя, якія паступова становяцца нормай. Гаспадарчым судом заключаны пагадненні аб электронным абмене інфармацыяй з выканаўчымі камітэтамі, суб'ектамі гаспадарання, падатковымі і іншымі органамі. Ёсць тэхнічныя магчымасці для відэаканферэнц-сувязі з кожным раёнам вобласці, каб прадстаўнікі суб'ектаў гаспадарання не ехалі на пасяджэнне ў Гродна, а ўдзельнічалі ў разглядзе гаспадарчай спрэчкі непасрэдна ў студыі райвыканкама. Пры гэтым дыстанцыйны разгляд справы ў рэжыме рэальнага часу забяспечваецца тэхнічнымі рэсурсамі для дэталёвага азнаямлення з неабходнымі дакументамі.

Дарэчы, ужо ёсць вопыт разгляду гаспадарчых спрэчак у электронным фармаце і на міжнародным узроўні. Летась у рэжыме відэаканферэнц-сувязі гаспадарчы суд Гродзенскай вобласці разглядаў скаргу разам са сваімі калегамі з Казахстана, і апошнія выказалі гатоўнасць прадоўжыць такое супрацоўніцтва.

Разам з тым, сёння ў заканадаўстве няма канцэпцыі электроннага правасуддзя і, адпаведна, адсутнічаюць канкрэтныя і паслядоўныя захады па яго стварэнні і развіцці. Напрыклад, калі ў Расіі дапускаецца разгляд любой грамадзянскай справы шляхам відэаканферэнц-сувязі (акрамя спраў, звязаных з дзяржаўнымі сакрэтамі), то ў Беларусі такіх нормаў практычна не існуе. Прымяненне ў судах электронных працэдур у нас, па сутнасці, апярэджвае заканатворчы працэс.

— Напэўна, адсюль вынікае шмат праблем?

— Так. Дапусцім, судовая справа разглядаецца з прымяненнем відэаканферэнц-сувязі, але тэхнічная сістэма раптам дае збой. І што рабіць тады з гэтай справай? Згодна з нашым заканадаўствам, падстаў адкласці яе разгляд з вышэйзгаданай тэхнічнай прычыны не існуе.

Ці такая сітуацыя: у судовым пасяджэнні з выкарыстаннем відэаканферэнц-сувязі патрабуецца ўдзел перакладчыка. Дзе ён павінен знаходзіцца? У судзе, які разглядае справу, альбо ў судзе па месцы знаходжання сведкі (можа, і ў іншай краіне)? Як папярэдзіць сведку аб крымінальнай адказнасці за адмову ад дачы паказанняў альбо дачу заведама непраўдзівых паказанняў? Альбо як забяспечыць законнасць электроннага подпісу? Усе гэтыя і іншыя пытанні патрабуюць нарматыўнага рэгулявання.

Пры гэтым, фарміруючы заканадаўства па ўкараненні электроннага правасуддзя, нельга не ўлічваць аб'ектыўныя рэаліі: не ўсе грамадзяне валодаюць неабходнымі камп'ютарнымі ведамі для звароту ў суд у электроннай форме. Таму, зразумела, электроннае правасуддзе павінна існаваць паралельна з яго ажыццяўленнем па грамадзянскіх справах на папяровых носьбітах. Прычым выбар працэсуальнага парадку разгляду справы павінен вызначацца яе бакамі. І калі адзін з іх супраць разгляду справы ў электронным фармаце, то працэдуру судавытворчасці неабходна ажыццяўляць у звычайным «папяровым» выглядзе.

Такім чынам, прымяненне электроннага правасуддзя не змяняе сутнасці і прызначэння судавытворчасці, а толькі садзейнічае дасягненню яго мэт — правільнаму і своечасоваму разгляду юрыдычных спраў. Для гэтага патрабуюцца прынцыпова новыя змяненні ў заканадаўстве.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

Дзяржаўнае прадпрыемства «АКАДЭМФАРМ»:

АКАДЭМІЧНЫ ЎЗРОВЕНЬ РАСПРАЦОЎКІ ФАРМАЦЭЎТЫЧНЫХ ПРАДУКТАЎ І СУЧАСНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ

Упатэнцыйнага спажыўца ёсць унікальная магчымасць выбраць фармпрадукты, якія не толькі распрацаваны на самым высокім навуковым узроўні, але і выраблены ва ўмовах сучаснай вытворчасці, якая адпавядае патрабаванням GMP. Узяць хоць бы полівітамінна-мінеральныя комплексы гандлёвай маркі «УНІВІТ». Састаў вітамінаў і мінералаў тут падабраны такім чынам, каб дагадзіць арганізму пэўнай групы сяроднестатыстычных жыхароў Беларусі, з улікам недахопу ў нашай вадзе і глебе пэўных макра- і мікраэлементаў, а ў харчовым рацыёне — пэўных вітамінаў. Такім чынам, беларускія вучоныя прапануюць тое, што патрэбна менавіта беларусам.

— Заснавальнікамі Рэспубліканскага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «АКАДЭМФАРМ» з'яўляюцца арганізацыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, і гэта абумоўлівае, перш за ўсё, высокі навуковы ўзровень фармацэўтычных распрацовак, — расказвае **намеснік дырэктара па навуковай рабоце, кандыдат біялагічных навук Вольга КАЗЮЧЫЦ.** — Нягледзячы на тое, што прадпрыемству ўсяго тры гады, у сакавіку гэтага года яно акрэдытавана ў якасці навуковай арганізацыі. Як паказваюць клінічныя даследаванні біяэквівалентнасці, айчынныя джэнерыкі вытворчасці «АКАДЭМФАРМ» адпавядаюць па эфектыўнасці і бяспецы арыгінальным прэпаратам. Варта адзначыць, што па кошце джэнерыкі нашай вытворчасці даступныя беларускаму спажыўцу.

Высокі ўзровень навуковых распрацовак «АКАДЭМФАРМ» заснаваны на тым, што мы працуем, у першую чаргу, толькі з высакаякаснымі субстанцыямі вядомых фірмаў таго ж Ізраіля, Даніі або Індыі. Па-другое, выкарыстоўваем высакаякасныя інавацыйныя дапаможныя рэчывы. Нарэшце, прапануем інавацыйныя тэхналагічныя рашэнні.

Мэта фармраспрацоўкі пераральных лекавых формаў — прапанаваць такія састаў і тэхналогію вытворчасці таблетак або капсул, якія забяспечылі б біядаступнасць джэнерыка, адпаведную біядаступнасці арыгінальнага лекавага сродку. Іншымі словамі, у кожным аддзеле страўнікава-кішачнага тракта з таблеткі/капсулы джэнерыка дзейнае рэчыва павінна вызваляцца з той жа хуткасцю, што і з таблеткі арыгінальнага прэпарата.

У прадпрыемства выдатная доследна-тэхналагічная і аналітычная база. Лабараторнае тэхналагічнае абсталяванне дазваляе ва ўмовах лабараторыі атрымаць таблеткі розных тэхналагічных варыянтаў, выявіць усе дэталі кожнай стадыі тэхналагічнага працэсу, што, безумоўна, скарачае этап пераходу да маштабнай вытворчасці прэпаратаў. Абсталяванне, якое дазваляе мадэляваць розныя аддзелы страўнікава-кішачнага тракта і даследаваць хуткасць тэхналагічнага вызвалення актыўнай субстанцыі, прымяняецца для вызначэння in vitro тэхналагічнага варыянта, які поўнасцю адпавядае кінетыцы растварэння арыгінальнага прэпарата. Іншымі словамі, мы можам узяць арыгінальны лекавы прэпарат і нашу таблетку-джэнерык, запусціць іх у спецыяльна створанае штучнае асяроддзе страўніка і кішэчніка і пераканацца, што дзейнае рэчыва абедзвюх таблетак вызваляецца абсалютна аднолькава. Сучаснае абсталяванне для аналізу дазваляе нам паспяхова распрацоўваць методыкі хімічнага, мікрабіялагічнага і фармацэўтыка-тэхналагічнага аналізу фармсубстанцый, паўпрадуктаў і гатовай прадукцыі.

Вольга КАЗЮЧЫЦ, намеснік дырэктара па навуковай дзейнасці, прапануе ўжываць «Кардывітол», здольны запаволіць працэс старэння арганізма.

— Раскажыце, калі ласка, пра людзей, якія займаюцца распрацоўкай новых прэпаратаў...

— З 11 нашых даследчыкаў 8 — ва ўзросце да 29 гадоў, гэта маладыя людзі, нядаўнія выпускнікі айчынных ВНУ — тэхнолагі, хімікі, біёлагі, якія валодаюць сучаснымі ведамі, неабходнымі для даследаванняў у галіне фармраспрацоўкі. І гэта вельмі важна, паколькі фармацэўтычная прамысловасць развіваецца надзвычай актыўна.

— Распрацоўку якіх прэпаратаў ажыццяўляе сёння навуковы калектыў «АКАДЭМФАРМ»?

— Мы выконваем навукова-даследчыя і доследна-тэхналагічныя работы па больш як 20 сучасных эфектыўных лекавых сродках розных фармакатэрапеўтычных груп. На этапе падрыхтоўкі да правядзення біяэквівалентных клінічных даследаванняў джэнерыкі для лячэння артэрыяльнай гіпертэнзіі на аснове валсартану і кандэсартану, гіпаліпідэмічны лекавы сродак разувастатын, лекавы сродак для лячэння атлусцення арлістат і шэраг іншых. На розных стадыях фармраспрацоўкі прэпараты для лячэння захворванняў страўнікава-кішачнага тракта, сардэчна-сасудзістых захворванняў, бясплоднасці, анкалагічных і вірусных захворванняў, астэапарозу і іншыя.

Некаторыя распрацоўкі фінансуюцца ў межах заданняў дзяржаўных навуковых праграм за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Цяпер «АКАДЭМФАРМ» выконвае 9 такіх заданняў. Акрамя гэтага, мы вядзём яшчэ 15 ініцыятыўных распрацовак за кошт уласных сродкаў прадпрыемства.

Сёлета ўжо асвоены ў вытворчасці капсулы «Урсаклін» — аналаг гепататропных прэпаратаў «Урсафальк» і «Урсасан», антыгіпертэнзіўны сродак «Лазартан» — аналаг прэпарата «Казаар» і прэпарат для лаважу кішэчніка «Д-Фаржэкт» — аналаг прэпарата «Фортранс».

Варта адзначыць, што ў комплексе работ па стварэнні новых лекавых сродкаў этап маштабавання тэхналогій і асваення прамысловай вытворчасці — адзін з самых адказных, паколькі патрабуе зладжанай работы як навуковага, так і вытворчага персаналу. На нашым інавацыйным прадпрыемстве створана сістэма ўкаранення новых тэхналагічных рашэнняў. Нягледзячы на тое, што завод выпусціў першую прадукцыю тры гады таму, ужо другі год у нас ідзе рэканструкцыя. Фармтэхналогіі не стаяць на месцы, і трэба пастаянна развівацца.

— З якімі айчыннымі і замежнымі прадпрыемствамі, арганізацыямі супрацоўнічае «АКАДЭМФАРМ»?

— У першую чаргу варта назваць інстытуты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: Інстытут біяарганічнай хіміі, Інстытут мікрабіялогіі, Інстытут фізікі, Інстытут фізіка-арганічнай хіміі, Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі. Выконваюцца сумесныя праекты з казахстанскім Міжнародным навукова-вытворчым холдынгам «Фітахімія». Плённа супрацоўнічаем з індыйскімі, ізраільскімі, французскімі, польскімі, дацкімі, украінскімі, літоўскімі, славацкімі, харвацкімі фірмамі. І колькасць нашых партнёраў пастаянна расце.

«АКАДЭМФАРМ» — невялікае па колькасці супрацоўнікаў прадпрыемства. Тут працуе ўсяго 75 чалавек. Тым не менш, яны забяспечваюць выпуск на беларускі рынак значнага аб'ёму лекавых прэпаратаў і біялагічна актыўных дабавак.

Біялагічна актыўныя дабаўкі дапамогуць адчуваць сябе здаровым доўгія гады.

БАДы і лекі

Дзяржаўнае прадпрыемства «АКАДЭМФАРМ» ажыццяўляе выпуск наступных біялагічна актыўных дабавак і лекавых сродкаў:

- Полівітамінны комплекс **«УНІВІТ»** (змяшчае камбінацыю неабходных для жыццядзейнасці арганізма вітамінаў, а таксама магній, жалеза і аргінін. Рэкамендуецца пры павышанай фізічнай актыўнасці, незбалансаваным харчаванні).
- Полівітамінна-мінеральны комплекс **«УНІВІТ мінерал»** (змяшчае камбінацыю з 13 вітамінаў і 12 макра- і мікраэлементаў, у тым ліку ёд, бор, цынк, селен).
- Полівітаміны і мінералы для жанчын **«УНІВІТ Ева»** (пэўны састаў вітамінаў і асноўных мінералаў, неабходных для забеспячэння нармальнага абмену рэчываў у арганізме жанчыны любога ўзросту).
- Полівітаміны і мінералы **«УНІВІТ кардыя»** (для паляпшэння работы сэрца і сасудаў).
- Полівітаміны і мінералы для падлеткаў **«УНІВІТ тынейджар»** (збалансаваная камбінацыя вітамінаў, макра- і мікраэлементаў для нармальнага функцыянавання арганізма ў перыяд інтэнсіўнага росту і палавога выспявання).
- Полівітаміны і мінералы **«УНІВІТ біяэнергія»** (комплекс для прафілактыкі дэфіцыту вітамінаў групы В, пры павышанай фізічнай актыўнасці, занятках спортам, пры стрэсе, высокіх разумовых нагрузках, для прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў).
- **«Наатрыцын»** (з экстрактам гінкга білоба і ліпоевай кіслатой; спрыяе нармалізацыі абмену рэчываў, запавольвае старэнне клетак галаўнога мозгу, павышае канцэнтрацыю ўвагі і памяці, валодае антыаксідантным дзеяннем).
- **«Таматагенін»** (крыніца магутнага антыаксіданту — лікапіну).
- **«Кардывітол»** (дзякуючы рэчыву, якое змяшчае, напрыклад, чырвоны вінаград, нармалізуе абменныя працэсы і папярэджвае заўчаснае старэнне арганізма).
- **«Ментум»** (змяшчае валяр'яну, мяту, мелісу і святаяннік, спрыяе нармалізацыі сну, паляпшае здольнасць пераносіць павышаныя разумовыя нагрузкі і эмацыянальны стрэс).

Уся работа фармацэўтычнай кампаніі рэгулюецца адпаведнымі міжнароднымі патрабаваннямі, паколькі размова ідзе пра эфектыўнасць і бяспеку лекаў. У нашай краіне шмат робіцца для таго, каб падобная прадукцыя адпавядала такім патрабаванням. Да гэтага імкнецца і «АКАДЭМФАРМ».

Сучасная вытворчасць адпавядае патрабаванням GMP.

«АКАДЭМФАРМ» адзіны ў галіне выпускае такі джэнерык, як іматыніб, для лячэння анкагеметалагічнага захворвання — хранічнага міелалейкозу. Сярод вядомых прэпаратаў завода — прэпарат з даказаным дзеяннем у дачыненні да вірусаў грыпу і іншых рэспіраторных захворванняў «Флустоп» (асельтамівір), а таксама такія лекавыя сродкі, як «Фаржэкт» і «Д-Фаржэкт» на аснове макраголу для лячэння запораў, лаважу кішэчніка перад хірургічнымі і дыягнастычнымі працэдурамі, антыгіпертэнзіўны сродак «Лазартан», гепатапратэктар «Урсаклін».

Лекавыя сродкі беларускай вытворчасці — выдатная альтэрнатыва дарагім замежным прэпаратам.

- **«Флустоп»** (супрацьвірусны прэпарат для прафілактыкі і лячэння вострых рэспіраторных вірусных захворванняў).
- **«Фаржэкт» і «Д-Фаржэкт»** (джэнерычныя лекавыя сродкі, якія ўжываюцца ў якасці слабіцельнага сродку і для ачышчэння кішэчніка перад даследаваннем або аперацыяй).
- **«Лазартан»** (антыгіпертэнзіўны сродак).
- **«Урсаклін»** (гепатапратэктар, які ўжываецца для растварэння камянёў жоўцевага пузыра, лячэння гепатыту, першаснага біліярнага цырозу і гастрыту з рэфлюксам жоўці).
- **«Іматыніб»** (супрацьпухлінны сродак).
- **«Цынарызін-НАН»** (прэпарат для лячэння парушэнняў мазгавога і перыферычнага кровазвароту, прафілактыкі мігрэні і хваробаў руху).
- **«Пентаксіфілін-НАН»** (паляпшае кровазварот пры сасудзістай паталогіі вачэй і ўнутранага вуха, парушэннях перыферычнага кровазвароту пры атэрасклерозе і дыябеце).

Прадпрыемства рэалізуе сваю прадукцыю праз дзяржаўную і прыватную аптэчную сетку (РУП БелФармацыя», ТАА «Іскамед», СЗАТ «Медвакс», ЗАТ «Уніфарм» і інш.).

Святлана БАРЫСЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Ліцензія № 02040/874, выдана 18.11.2009 г. Міністэрствам аховы здароўя РБ. УНП 191209942

■ Выпрабавана на сабе

АДПАЧЫЦЬ «ДЗІКУНОМ» У ІСПАНІІ

паспрабаваў карэспандэнт «Звязды», і вось што з гэтага атрымалася

Адпачываць на моры мы з сябрам стараліся кожны год.

Да вялікай вады звычайна дабіраліся, як і ўсе: куплялі пуцёўку ў турфірме ці імчалі на цягніку ці аўтамабілі самастойна.

А сёлета сябар прапанаваў на шляху ў далёкія краіны абысціся без турфірмаў і ўсё арганізаваць самім. Шчыра кажучы, мы і раней, заводзячы знаёмствы з замежнымі турыстамі, часам даведваліся, што нямецкім ці французскім падарожнікам пуцёўкі на іх радзіме каштавалі куды танней, чым садралі з нас за аналагічны курорт айчынныя тураператары.

Сёлета вырашылі самастойна адолець маршрут у Іспанію.

Жыллё на ўзбярэжжы Міжземнага мора пад Барселонай таксама шукалі нядоўга. Выбар ў інтэрнэце вялікі. Звычайна прапануюцца нумары ці апартаменты адразу на цэлы месяц, а колькі ты пасля там збіраешся пражыць — твая справа. У гарадку, які мы аблюбавалі, цана вагалася ад 230 еўра і да бясконцасці. За 500 еўра — зусім прыстойнае жыллё каля самага мора з кухняй, халадзільнікам, посудам, двума спальнымі пакоямі. Калі падзяліць гэтыя грошы на дзве сям'і з чатырох чалавек — выходзіла 4 еўра на аднаго ў суткі. З такімі тарыфамі, згадзіцеся, нават «танны» Крым адразу страчвае прывабнасць.

Потым даведаліся, што з папярэднім заказам і браніраваннем можна было наогул не спяшацца і тым самым сэканоміць куды больш. Патрабавалася адно — мець смеласць прыехаць і шукаць жыллё на месцы. Верасень не вабіць еўрапейскага турыста, і цэны ў казачным курортным краі імкліва коцяцца ўніз. Усе атэлі прапануюць зніжкі. А які ж тут для беларуса канец сезона, калі спёка за трыццаць градусаў, а вада ў моры амаль як кіпень.

Пара з Мінска, з якой там пазнаёміліся, амаль месяц пражыла ў шыкоўным атэлі з цудоўным відам на мора. А калі сабраліся ад'язджаць, гаспадар прапанаваў пажыць яшчэ тыдзень, папрасіўшы ўсяго 50 еўра даплаты. Бо не сезон.

Яшчэ пытанне — як дабрацца з Мінска да Барселоны. Мы бачылі ў Іспаніі колькі разоў аўтамабілі з беларускімі нумарамі — едуць сюды нашы і на колах. Але, безумоўна, лепш за ўсё — самалёт. Знакаміты лаўкост з Вільнюса тут самы раз. Правілы простыя і прывабныя: чым раней закажаш білеты, тым танней яны могуць абысціся. Мы куплялі іх за два месяцы да вылету і заплацілі недзе па 240 долараў на чалавека за шлях у абодва канцы.

На «лаўкостаўскіх» рэйсах бясплатна можна перавозіць толькі ручную паклажу, а за багаж плаціць дадаткова. Паклажа не павінна перавышаць 10 кілаграмаў, быць адпаведнай формы, прычым яе ў аэрапорце могуць змераць спецыяльнай прыладай. На борце не кормяць і нават вады не дадуць — хіба толькі за грошы.

Затое самалёт, які нас вёз, быў навюсенькі «Боінг», нібы толькі што сышоў з канвеера. Іспанскі экіпаж вёў яго па-майстэрску. І так ліха прызямляўся ноччу, заходзячы з мора на Барселону, што пасажыры заапладзіравалі лётчыкам, нават не дачакаўшыся пасадкі.

Прыляцелі ноччу. Нязручны час прыбыцця — таксама «спецыфіка» танных перавозчыкаў. Мы вырашылі не марнаваць часу і заказалі таксі яшчэ напярэдадні. Абышлося яно ў 105 еўра на чацвярых.

Вадзіцелем аказалася маладая жанчына Наталля. Калісьці яна з'ехала з Краснадара ў пошуках лепшага жыцця ў Аргенціну. Адтуль перабралася сюды, выйшла замуж, нарадзіла двух дзяцей. Але нядаўна муж вярнуўся на радзіму ў Індыю, і ёй цяпер трэба гадаваць дзяцей самой. Вось і падрабляе ноччу, возячы пасажыраў.

Пакуль рухаліся па начной Барселоне, паспелі падзівіцца не толькі прыгажосці і велічы начнога горада. На нашым шляху не трапілася ніводнага скрыжавання, ніводнага святлафора: вялікі шумны горад, на фоне якога айчынныя гарады здаюцца цяхімі пасёлкамі. Па эстакадах і тунэлях транзітнага калідора мы праляцелі літаральна за дзясятак хвілін.

Высадзіўшы нас у прызначаным месцы, Наташа не з'ехала адразу, а дачакалася, пакуль прыйдуць гаспадары і ўпусцяць нас у кватэру, дала неабходныя бытавыя парады. Гаспадарам, каб паведаміць пра наш прыезд, яна таксама патэлефанавала, бо тыя ведалі толькі родную мову, а мы размаўлялі яшчэ па-англійску... І плату Наталля ўзяла па тарыфе, рэшту аддала, як кажуць, да капейкі.

А раніцай мы ўжо знаёміліся з морам. Прыбярэжная паласа тут пазначана буямі, за якія не зойдзе ніякі карабель ці водны матацыкл. Не так, як у Крыме ці каля Сочы. Пляж бясплатны, але раніцай добра падмятаецца і прыгожа барануецца. Тут ёсць і бясплатны душ, каб пасля купання памыцца, хаця мора — чысцюткае.

Ежу мы там рыхтавалі самі, хаця танных кавярняў і бараў тут вельмі шмат. Да гонару гаспадароў, яны пакінулі гасцям пакет малака і нейкія сэндвічы — перакусіць пасля дарогі. А потым мы знаёміліся з мясцовымі крамамі. Цэны на асноўныя прадукты там — амаль што беларускія. А вось тавары выглядаюць інакш. І прадаюцца па-іншаму. Мяса, прынамсі, толькі ахалоджанае. Купляем мы, напрыклад, курыцу. «Для чаго вы яе купляеце?» — ветліва пытаецца прадавец. «Суп зварым і яшчэ з рысам пасмажым», — збянтэжана тлумачым, не разумеючы такі інтарэс. А прадавец бярэ нож і ліха разразае тушку на кавалачкі, складвае ўсё ў тры пакецікі. «Гэта — на суп, вось гэта — на другое, астатняе — кату ці сабаку, калі яны ў вас ёсць».

Так мы і рыбу куплялі, іншыя прадукты.

Дарэчы, суп з той іспанскай куркі атрымаўся пахучы і наварысты. Такую страву сёння можна пакаштаваць хіба толькі ў далёкай беларускай вёсцы, дзе дагэтуль не ведаюць, што такое карміць курэй камбікормам.

А наогул у Іспаніі зараз эканамічны крызіс. Скарачаюцца сацыяльныя выдаткі. Вялікі працэнт беспрацоўя, асабліва сярод моладзі. Але па людзях не скажаш, што яны ў роспачы. На вуліцах усміхаюцца, весела вітаюць адно аднаго. Бары вечарам — паўнюткія. Жыхары суседніх дамоў прыходзяць сюды выпіць піва ці кавы, разам паглядзець футбол. Прыходзяць сем'ямі. Мы жывём у звычайнай кватэры пяціпавярховага дома, таму і нас, лічачы сваімі, суседзі пры сустрэчы таксама вітаюць ласкавым працяжным «Олага».

Кожны дзень у цэнтры горада ладзіцца прадуктовы кірмаш, тавар на які пастаўляюць фермеры. Пакупнікоў многа, асабліва пажылых. Няспешна выбіраюць фрукты са скрынь, дзе ўсё свежае і таннае. Прадаўцы цярпліва тлумачаць, што ў іх самае смачнае. Абавязкова выб'юць на касе чэк, усміхнуцца і падкінуць у пакет яблык ці гронку вінаграду звыш аплачанага.

А пасля дзвюх гадзін дня на гэтым месцы зноў чысцюткая вуліца, па якой каля фірменных буцікаў шпацыруюць гараджане і турысты.

Удалося паназіраць і за працай мясцовай паліцыі. Кішэнных злодзеяў тут хапае, і гаварыць пра гэта не саромеюцца. Відаць, нехта з адпачывальнікаў убачыў злодзея на пляжы за яго заняткам і патэлефанаваў у паліцыю. Нарад з'явіўся літаральна праз хвіліну, калі хлопец азіяцкага паходжання шыбаваў паміж шэзлонгаў на выхад. Паліцэйскія выйшлі з аўтамабіля, але на пляж не пайшлі: відаць, не хацелі турбаваць адпачывальнікаў. Злодзей убачыў іх, пачаў мітусіцца, а прадстаўнікі закону крочаць паралельна яму, усміхаюцца і клічуць жэстамі да сябе. Хлопец і ў мора гатовы быў кінуцца, а тым часам яшчэ адзін нарад пад'ехаў, перакрыў яму шлях і туды. Ніякіх табе пагоняў і драматычных эфектных рухаў.

Памітусіўся ўцякач ды і пайшоў у роспачы да паліцэйскай машыны — здавацца.

Аднойчы мы вырашылі наведаць мясцовы аўтакірмаш. Пахадзілі каля саміх машын, потым наблізіліся да натоўпу, які сабраўся на ўскрайку пляцоўкі. Людзі стаялі з нейкімі плакатамі, транспарантамі, крычалі і нешта патрабавалі. Неяк вельмі весела ўсё выглядала. Вакол, праўда, было некалькі паліцэйскіх нарадаў, прычым не толькі з муніцыпальнай паліцыі. Мы з імі павіталіся, паліцэйскія нам адказалі, паўсміхаліся. Потым паліцыя паехала, натоўп разышоўся.

Толькі з вячэрніх навін даведаліся, што там было: аказваецца, мы «паўдзельнічалі» ў мітынгу за незалежнасць Каталоніі.

А цэны на аўтамабілі там, дарэчы, былі цікавыя нават з улікам вялікіх айчынных мытных плацяжоў. Толькі вось гнаць да Беларусі тыя машыны вельмі і вельмі далёка.

Яшчэ колькі слоў пра магазіны. Восень там — час зніжак. Ды якіх — напалову, а то і адразу працэнтаў на семдзесят. Нагледзеў я ў адным буціку добрыя джынсы — праўда, даволі дарагія. Заходжу аднойчы, а на вітрыне каля тых штаноў надпіс: «зніжка» (вядома, па-іспанску). Цана — 30 еўра. Калі двое штаноў адразу бярэш — па 25 абыдуцца.

Клічу сябра: «Давай возьмем кожнаму за 25». Ён падумаў і кажа: «Чаго спяшацца. Прыйдзем праз пару дзён — можа, і за 15 еўра купім».

Паслухаўся я. Прыйшлі мы ў той магазін праз пару дзён. А нас чакала неспадзяванка: зніклі нашы джынсы. На вітрыне віселі жаночыя блузкі. А той, «наш», стосік з джынсамі знайшлі мы на падлозе ў закутку. Але прадаваць нам адтуль нічога не захацелі. Бо тавар быў падрыхтаваны да адпраўкі на продаж у краіны за межы Еўрасаюза, сказалі нам у краме. Відаць, хутка ўбачым мы тыя штаны на нашых Ждановічах. Толькі страшна нават думаць, па якой цане.

Паўмесяца на моры праляцелі хутка. Дадому дабраліся без прыгод, калі не лічыць зноў вельмі жорсткага кантролю падчас пасадкі ў самалёт у Барселоне — наконт вагі і памеру багажу. Калі што не так, штрафы служачымі «Рынэйра» выпісваюцца тут жа. Правяраюць выбарачна, але хвалюецца ўся чарга.

А па дарозе ў аэрапорт яшчэ раз уразіў праезд праз Барселону. Цяпер мы імчалі днём, але і ў светлы час праляцелі гэты вялікі горад, не спыняючыся. Мне ўсё ж здаецца, што нашы гарадскія ўлады нешта не тое робяць, спрабуючы ўпарадкаваць дарожны рух, толькі нарошчваючы колькасць святлафораў і «ляжачых паліцэйскіх» ды бясконца рамантуючы кальцавую магістраль.

Прыляцеўшы ў Мінск, падлічылі свае турыстычныя расходы. Балазе, было з чым параўнаць. Знаёмыя ездзілі ў той жа край праз турфірму і заплацілі за пуцёўкі недзе па 1100 еўра з чалавека. Мы патрацілі ў два разы меней і ўражанняў у нас не менш. Гэта не ў крыўду паважаным турфірмам. Гэта — як прапанова больш уважліва і гуманна паглядзець на кошт сваіх пуцёвак.

Віктар ВІКЕНЦЬЕЎ

Цэны на асноўныя прадукты там — амаль што беларускія. А вось прадаюцца яны па-іншаму. Купляем мы, напрыклад, курыцу. Прадавец бярэ нож і ліха разразае тушку на кавалачкі, складвае ўсё ў тры пакецікі. «Гэта — на суп, вось гэта — на другое, астатняе — кату ці сабаку, калі яны ў вас ёсць».

ДЭПАРТАМЕНТ ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА
10 кастрычніка 2013
Прамінена
Подпіс

белагропромбанк
традиции будущего

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для юридических лиц сто шестьдесят пятого выпуска

1. Наименование эмитента:
а) полное наименование:
на белорусском языке – адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк»;
на русском языке – открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – Банк);
б) сокращенное наименование:
на белорусском языке – ААТ «Белаграпрамбанк»;
на русском языке – ОАО «Белагропромбанк».

2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
Телефон: (017) 229 63 25, факс (017) 229 64 41.
Электронный адрес E-mail: info@belapb.by.
УНП 100693551, ОКПО 00040577.

3. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовая финансовая отчетность Банка, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии облигаций, и сроки их публикации
Годовая финансовая отчетность Банка ежегодно публикуется в газетах «Звязда» и «Рэспубліка» не позднее 25 апреля года следующего за отчетным.
Годовая финансовая отчетность Банка за 2012 год опубликована Банком 30.03.2013 в газетах «Звязда» и «Рэспубліка».
В газете «Звязда» публикуется следующая информация:
- в случае принятия решения о реорганизации или ликвидации Банка – не позднее 2-х месяцев с момента принятия такого решения;
- в случае возбуждения в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;
- в случае внесения изменений в проспект эмиссии облигаций – не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

4. Размер уставного фонда Банка
Уставный фонд Банка составляет 6 603 635 046 000 (Шесть триллионов шестьсот три миллиарда шестьсот тридцать пять миллионов сорок шесть тысяч) белорусских рублей.

5. Депозитарием, обслуживающим Банк, является Депозитарий ценных бумаг Банка (адрес: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3), действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, регистрационный номер 02200/5200-1246-1085, срок действия лицензии до 18.07.2022.

6. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего
Банк преобразован из Белорусского республиканского банка Агропромбанк СССР учредительной конференцией 11.02.1991 и зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 03.09.1991, регистрационный № 20. Устав Банка утвержден общим собранием акционеров 11.02.1991 (протокол №1) (с изменениями и дополнениями, зарегистрированными постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 14.06.2013 №20).
Банк в своей деятельности руководствуется законодательством Республики Беларусь, международными договорами Республики Беларусь, локальными нормативными правовыми актами Банка, а также Уставом Банка.

7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций сто шестьдесят пятого выпуска
7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение
Решение о выпуске облигаций сто шестьдесят пятого выпуска для юридических лиц в соответствии с Уставом Банка утверждено Наблюдательным советом Банка 20.09.2013, протокол № 30.
7.2. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям
Выпуск облигаций осуществляется без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по таким облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).
По состоянию на 01.09.2013 нормативный капитал Банка составляет 9 016 716,3 млн. бел. рублей.
7.3. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций
Выпуск облигаций осуществляется в целях привлечения денежных средств юридических лиц, сокращения дефицита ликвидности Банка.
Привлеченные средства от размещения облигаций будут направлены для обеспечения фондирования активов Банка.
7.4. Выпуск облигаций согласован Национальным банком Республики Беларусь (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 03.10.2013 № 575).
7.5. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций
Форма выпуска и вид облигаций – именные, процентные, неконвертируемые, бездокументарные.
Объем эмиссии облигаций составляет 200 000 000 000 (Двести миллиардов) белорусских рублей. Номинальная стоимость одной облигации – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей. К размещению предлагаются 200 000 (Двести тысяч) штук облигаций, серии ОБ165, номера 0000001 – 0200000.
7.6. Период проведения открытой продажи облигаций
Дата начала периода размещения облигаций – 16.10.2013, дата окончания периода размещения облигаций – 09.01.2014.
7.7. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Размещение облигаций сто шестьдесят пятого выпуска осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования Национальным банком Республики Беларусь выпуска облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже облигаций сто шестьдесят пятого выпуска.
Первичное размещение облигаций в течение периода размещения осуществляется на внебиржевом рынке путем открытой продажи в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.
Владельцами облигаций могут быть юридические лица. Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации, обязаны перечислить денежные средства в безналичном порядке на счет Банка, указанный в договоре.
Банк вправе не заключать договоры купли-продажи облигаций в период размещения, если условия, определенные решением о выпуске облигаций, становятся для Банка экономически невыгодными. Решение о не заключении договоров купли-продажи облигаций в период размещения принимает уполномоченный орган Банка.
Продажа облигаций осуществляется по текущей стоимости на дату совершения операции и рассчитывается по формуле:

$$С = Нп + Дн,$$

где:
С – текущая стоимость облигации;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Дн – накопленный процентный доход.
В день начала открытой продажи облигаций текущая стоимость облигации равна ее номинальной стоимости.
Накопленный процентный доход рассчитывается по следующей формуле:

$$Дн = \frac{Нп \times Пд1 \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right) + Нп \times Пд2 \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right) + \ldots + Нп \times Пдп \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right)}{100}$$

где:
Дн – накопленный процентный доход;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, ... Пдп – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенная на 18 (Восемнадцать) процентных пунктов, за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной;
Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
День начала размещения облигации (дата выплаты последнего процентного дохода) и день расчета текущей стоимости облигации считаются одним днем. При этом за даты выплаты процентного дохода принимаются даты, установленные в пункте 7.8 настоящей краткой информации.
7.8. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты, период начисления процентного дохода
Выплата дохода по облигации производится в виде процентного дохода 1 раз в месяц за истекший период начисления дохода владельцам облигаций, которые указаны в реестре владельцев облигаций, а также владельцам облигаций, которые приобрели облигации в период размещения согласно соответствующим договорам после указанного срока формирования реестра до даты выплаты процентного дохода. Даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода указаны в нижеследующей таблице:

ПЕРИОДЫ НАЧИСЛЕНИЯ ПРОЦЕНТНОГО ДОХОДА				Даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода
Порядковый номер периода начисления дохода	Начало периода	Конец периода, дата выплаты дохода	Продолжительность периода (дней)	
1	2	3	4	5
1	17.10.2013	16.11.2013	31	15.11.2013
2	17.11.2013	16.12.2013	30	13.12.2013
3	17.12.2013	14.01.2014	29	13.01.2014
ИТОГО:	x	x	90	x

Процентный доход выплачивается путем перечисления в безналичном порядке суммы процентного дохода на счет владельца облигации в белорусских рублях в дату окончания периода начисления процентного дохода.
В случае если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Проценты на сумму процентного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящей Краткой информации понимаются выходные дни, государственные праздники, праздничные дни и другие, являющиеся нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Процентный доход по процентным облигациям за первый период начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций по дату его выплаты включительно. Процентный доход по процентным облигациям за последующие периоды начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (дату погашения) включительно.
Начисление процентного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций процентный доход не начисляется.
Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период начисления дохода, определенный в соответствии с настоящей Краткой информацией, по процентной ставке, равной ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), увеличенной на 18 (Восемнадцать) процентных пунктов.
Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Дп = \frac{Нп \times Пд1 \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right) + Нп \times Пд2 \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right) + \ldots + Нп \times Пдп \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right)}{100}$$

где:
Дп – процентный доход, выплачиваемый периодически в течение срока ее обращения;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, ... Пдп – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенная на 18 (Восемнадцать) процентных пунктов, за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной;
Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Облигации предоставляют владельцу право на получение процентного дохода, а также номинальной стоимости облигаций при их погашении в денежных единицах, в которых выражена их номинальная стоимость.
7.9. Срок и порядок обращения облигаций
Обращение облигаций сто шестьдесят пятого выпуска осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Срок обращения облигаций – 90 календарных дней с 16.10.2013 по 14.01.2014. День начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.
Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении осуществляется юридическими лицами на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и (или) биржевом рынке в соответствии с порядком, установленным ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа).
Сделки с облигациями на вторичном рынке прекращаются за один рабочий день до даты выплаты процентного дохода (погашения) облигаций.
7.10. Дата погашения облигаций – 14.01.2014.
7.11. Условия и порядок досрочного погашения облигаций
Наблюдательный совет Банка вправе принять решение о досрочном погашении облигаций сто шестьдесят пятого выпуска либо его части до даты окончания срока обращения:
- неразмещенных в полном объеме эмиссии либо оставшейся части неразмещенных облигаций на момент принятия соответствующего решения;
- приобретенных Банком в полном объеме эмиссии либо не в полном объеме эмиссии до даты окончания срока обращения.
7.12. Условия и порядок приобретения облигаций Банком до даты начала их погашения
В период обращения облигаций Банк может осуществлять приобретение облигаций до даты начала их погашения у любого их владельца:
- 1-го, 10-го, 20-го числа каждого месяца по текущей стоимости;
- в иные сроки на условиях, утвержденных уполномоченным органом Банка.
Приобретение облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке в объеме и в порядке, определенными соответствующим договором купли-продажи, заключенным между владельцем облигаций и Банком, и (или) биржевом рынке в соответствии с регламентом Биржи.
В случае если дата приобретения облигаций Банком выпадает на нерабочий день, приобретение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Проценты на сумму приобретения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
Для продажи облигаций Банку владелец облигаций должен:
а) не позднее одного рабочего дня до предполагаемой даты продажи представить в Банк заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
наименование владельца облигаций;
наименование ценной бумаги;
количество облигаций, предложенных для продажи;
банковские реквизиты счета для перечисления денежных средств за проданные облигации (в случае если приобретение облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке);
согласие с условиями приобретения облигаций Банком, которые изложены в настоящей Краткой информацией;
юридический адрес (место нахождения) и контактные телефоны владельца;
подпись уполномоченного лица и печать владельца – юридического лица;
б) на внебиржевом рынке:
обеспечить в порядке и сроки, определенные соответствующим договором купли-продажи, перевод указанных в заявлении облигаций со счета «депо» владельца – юридического лица на счет «депо» Банка;
при необходимости представить в Банк карточку с образцами подписей, заверенную в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
в) на биржевом рынке:
не позднее дня продажи перевести в соответствии с законодательством Республики Беларусь указанные в заявлении облигации на соответствующий раздел своего счета «депо» для участия в торгах на Бирже.
В случае несоблюдения владельцем облигаций сроков представления заявления о продаже и (или) перевода указанных в заявлении облигаций – приобретение облигаций Банком не осуществляется.
Банк имеет право осуществлять на вторичном рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь:
- дальнейшую реализацию приобретенных облигаций Банка;
- иные действия с приобретенными облигациями Банка.
7.13. Порядок погашения облигаций
Погашение облигаций производится 14.01.2014 на основании реестра владельцев облигаций. Реестр владельцев облигаций составляется на 13.01.2014. В случае если дата погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
При погашении владельцы облигаций обязаны перевести погашаемые облигации на счет «депо» Банка № 100004, раздел 18, счет «депо» ЛОРО № 1000009, раздел 00 в срок не ранее даты, на которую формируется реестр владельцев облигаций для целей погашения, и не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления на счет владельца облигаций (выплаты владельцу облигаций) денежных средств, необходимых для погашения. Для осуществления перевода облигаций на счет «депо» Банка в депозитарий владелец облигаций обязан представить поручение «депо», в котором в реквизите «Назначение и (или) основание» указывается: «Перевод ценных бумаг на счет «депо» эмитента в связи с их погашением».
При погашении облигаций владельцу выплачивается в безналичном порядке номинальная стоимость облигаций, а также процентный доход за период начисления.
7.14. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций
Реестр владельцев облигаций составляется на 13.01.2014.
7.15. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании выпуска облигаций несостоявшимся, запрещении выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
Банком не предусматривается возможность признания выпуска облигаций несостоявшимся.
В случае запрещения выпуска облигаций, Банк в месячный срок с момента получения уведомления от Департамента по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь о запрещении выпуска облигаций возвращает инвесторам денежные средства, полученные в оплату размещенных облигаций, и накопленный процентный доход за период с даты, следующей за датой продажи (датой выплаты последнего процентного дохода) по дату получения уведомления включительно, и письменно уведомляет Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь о возврате указанных средств инвесторам в полном объеме.

8. Порядок и условия осуществления Банком выплат в случае отсутствия (наличия недостоверной) информации
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, депонируется на соответствующем счете Банка и выплачивается при непосредственном обращении владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе.
При погашении облигаций в случае необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны предоставить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.
Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.

9. Дата и номер государственной регистрации облигаций (заполняется Департаментом по ценным бумагам)
Облигации сто шестьдесят пятого выпуска зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 10.10.2013.
Регистрационный номер: 5-200-02-2013.

10. Другие сведения, указываемые по решению эмитента
Налогообложение доходов по облигациям осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

11. Сведения о месте, времени и способе ознакомления с подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)
С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) сто шестьдесят пятого выпуска можно ознакомиться в филиалах, отделениях, расчетно-кассовых центрах, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.
Получить справку о продаже облигаций можно в Контакт-центре Банка по короткому номеру 136, ОПЕРУ центрального рабочего времени аппарата Банка по адресу: Минск, пр-т Жукова, 3, тел. (8-017) 218-57-11, а также в следующих филиалах Банка:
г. Брест, ул. Воровского, 11, тел. (8-0162) 95-82-23, 97-64-23,
г. Витебск, ул. Димитрова, 31, тел. (8-0212) 35-00-21, 37-23-14,
г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, тел. (8-0232) 79-26-89, 79-27-46,
г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 110, тел. (8-0152) 52-25-87, 52-63-42,
г. Могилев, пр-т Мира, 55, тел. (8-0222) 29-37-50, 29-37-52,
г. Минск, пр-т Победителей, 91, тел. (8-017) 209-77-91, 209-77-26,
г. Минск, ул. Ольшевского, 24, тел. (8-017) 229-65-35, 229-65-38.

Заместитель Председателя Правления ОАО «Белагропромбанк» **С.П. Чугай**

Главный бухгалтер ОАО «Белагропромбанк» **М.А. Шаповалова**

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00–20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

■ Май на ўвазе

РТУТНЫЯ ТЭРМОМЕТРЫ — ПЕРСОНЫ НОН-ГРАТА

Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае спыніць да 2020 года выкарыстанне ртуці ў тэрмометрах і прыборах для вымярэння крывянога ціску.

Новая ініцыятыва САЗ прымеркавана да прыняцця 10 кастрычніка гэтага года Мінамацкай канвенцыі аб ртуці. Канвенцыя носіць імя японскага горада Мінамата, дзе адбылося найбуйнейшае забруджванне навакольнага асяроддзя ртуццю, у выніку якога пацярпелі больш як 30 тысяч чалавек.

У адпаведнасці з канвенцыяй, краіны могуць працягваць выкарыстоўваць ртуць у медыцынскіх вымяральных прыборах да 2030 года ў асаблівых абставінах. Аднак Сусветная арганізацыя аховы здароўя і няўрадавая арганізацыя «Ахова здароўя без шкоды» лічаць, што патэнцыяльныя негатыўныя наступствы ртуці для здароўя настолькі сур'ёзныя, што трэба прыкласці ўсе намаганні для таго, каб намечаная ў канвенцыі асноўная мэта была дасягнута ўжо да 2020 года.

Ртуць і яе розныя спалучэнні аказваюць сур'ёзнае таксічнае ўздзеянне на здароўе, паражаючы мозг чалавека, нервовую сістэму, ныркі і стрававальную сістэму. Асаблівую пагрозу ртуць уяўляе для ўнутрывантробнага і ранняга развіцця дзяцей, правакуючы разумовую адсталасць. Як зазначыла генеральны дырэктар САЗ Маргарэт Чэн, ртуць з'яўляецца адным з дзесяці хімічных рэчываў, якія выклікаюць найбольшую заклапочанасць у медыкаў: яна распаўсюджваецца і захоўваецца ў экасістэмах на працягу жыцця некалькіх пакаленняў.

Акрамя адмовы ад выкарыстання ртуці ў медыцынскіх вымяральных прыборах, Сусветная арганізацыя аховы здароўя мае намер таксама спыніць выкарыстанне ртутных мясцовых антысептыкаў і ртутных касметычных сродкаў для адбельвання скуры. Сярод задач, якія ставіць перад сабой САЗ, — мінімізацыя наступстваў для здароўя выкарыстання ртуці ў саматужнай і дробнай золатаздабычы і згортванне выкарыстання амальгамы ў стаматалогіі.

Манамацкую канвенцыю падпісалі 102 краіны, у тым ліку краіны Еўрасаюза, Канада, Японія, Арменія, Грузія, Малдова, Расія і іншыя. Беларусі пакуль у гэтым спісе няма. І цяпер канвенцыя адкрыта для падпісання...

Зараз арганізацыі-ўдзельніцы міжнароднай сеткі па ліквідацыі трывалых арганічных забруджвальнікаў звяртаюць увагу ўрадаў на неабходнасць інвентарызацыі ўсіх крыніц забруджвання ртуццю, а таксама распрацоўку мер па ліквідацыі асноўных крыніц.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ А вы ведалі?

МАТ НА БАКСЁРСКІМ РЫНГУ

Сёлета 10-гадовы юбілей святкуе чэсбоксінг — гібрыдны від спорту, які арганічна спалучае бокс і шахматы. Гісторыя ўзнікнення гэтай дысцыпліны варта здымкаў фільма. Ідэя сумясціць несумяшчальнае належыць французскаму аўтару коміксаў Энры Белалю. Першы комікс пра «шахбокс» з'явіўся ў 1992 годзе. Але ажыццявіў авантурную задуму галандскі мастак Епе Рубінг, калі ў 2003 годзе ў Амстэрдаме адбыўся першы чэмпіянат свету па чэсбоксінгу. Не дзіўна, што першым чэмпіёнам у «інтэлектуальным боксе» стаў сам Рубінг.

У адрозненне ад коміксаў, дзе «бокса-шахматныя» паядынкі суправаджаюцца крывавымі сцэнамі, чэсбоксінг на рынгу строга падпарадкоўваецца правілам «мацярынскіх» відаў спорту. Адзін матч складаецца з пяці двуххвілінных баксёрскіх раўндаў і чатырох шахматных партый, кожная з якіх доўжыцца чатыры хвіліны. Паміж падыходамі — адна хвіліна, падчас якой спартсмены змяняюць баксёрскія пальчаткі на навушнікі (каб шум глядзельнай залы не перашкаджаў удзельнікам паядынку падчас шахматнага раўнда). Датэрміновая перамога прысуджаецца ў выпадку накаўта ці мата. Але, калі і баксёрскі, і шахматны паядынкі скончыліся нічыёй, перамогу аддаюць шчаслівчыку, які гуляў чорнымі фігурамі.

Дарэчы, ужо існуе Міжнародная федэрацыя чэсбоксінгу, якая плануе змагацца за ўключэнне гэтай дысцыпліны ў алімпійскую праграму.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

НА ГАЗОН ВЫХОДЗЯЦЬ «САМУРАІ»

Сёння зборная Беларусі па футболе правядзе свой чарговы паядынак. На жодзінскім стадыёне «Тарпеда» хлопцам Георгія Кандрацьева будзе супрацьстаяць зборная Японіі.

За дзень да таварыскай, але адказнай гульні, падрыхтоўныя работы на жодзінскай арэне амаль завяршылі. На шчыты ўжо прыладзілі японскія рэкламныя банеры, праверылі электраасвятленне, у касах ва ўсю прадаюцца квіткі, а госці з далёкіх астравоў на перадматчавай трэніроўцы паспелі праверыць якасць малахітавага газона. Напэўна, толькі тэлевізіёншчыкам застаецца наладзіць апаратуру, і ўсё — футбол можна пачынаць!

У Мінск зборная Японіі, удзельніца чатырох чэмпіянатаў свету, якая займае 42 радок рэйтынгу міжнароднай федэрацыі футбольных асацыяцый, прыляцела пасля спарынгу ў Сербіі, у якім саступілі балканцам 0:2. Пра адказнае стаўленне японцаў да сённяшняй сустрэчы сведчаць не толькі паважлівыя словы трэнера, насычаная на практыкаванні трэніроўка, а яшчэ і колькасць журналістаў, якія будуць асвятляць матч. Разам з камандай у Беларусь прыляцела больш за 80 прадстаўнікоў японскіх сродкаў масавай інфармацыі!

— У сувязі з тым, што наш прэс-цэнтр разлічаны прыкладна на 30 журналістаў, мы былі вымушаны перабазаваць яго ў трэнажорную залу, — прызнаецца **Яўген ГОРЫД, дырэктар стадыёна «Тарпеда»**. — Што тычыцца нашага газона, ён у добрым стане. Японская дэлегацыя ацаніла яго на «выдатна». Сустрэча пачнецца ў 15.15 — па просьбе гасцей. У гэты час у Токіа ўжо будзе позні вечар.

У Беларусі Японію прэзентуе даволі моцны па імёнах склад. Напрыклад, Кейсуке Хонда выступае за маскоўскі ЦСКА, Юта Нагамота гуляе за італьянскі «Інтэр», Ацута Учыда — за нямецкі «Шальке-04», а Шынджы Кагава выходзіць на поле ў форме славутага «Манчэстэр Юнайтэд». Цікава будзе чарговы раз убачыць, як наша зборная будзе выглядаць на фоне футбалістаў, якія прэзентуюць лепшыя футбольныя лігі свету.

— Зборная Беларусі — гэта фізічна падрыхтаваны сапернік, які добра контратакуе, — на перадматчавай прэс-канферэнцыі зазначыў **Альберта ДЗАКЕРОНІ, галоўны трэнер зборнай Японіі.** — Я хацеў бы згуляць супраць беларусаў хутка, з шэрагам розных камбінацый.

Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.

г. Жодзіна.

■ Першая сусветная вайна

ПЕРШЫ ГЕОРГІЕЎСКІ КАВАЛЕР ЛЯЧЫЎСЯ Ў ВІЦЕБСКУ

«Звязда» працягвае цыкл публікацый, прысвечаных падзеям Першай сусветнай вайны. Цікавы факт: аказваецца, першы з пачатку той вайны кавалер салдацкага Георгіеўскага крыжа пасля ранення знаходзіўся на лячэнні ў віцебскім шпіталі.

Казьма Кручкоў. Фота перыяду Першай сусветнай вайны.

Адважны казак Казьма Фірсавіч Кручкоў быў вядомы ўсёй Расіі. Яго фотапартрэты друкаваліся ў газетах, часопісах, яму прысвячалі вершы, песні, у гонар яго здымалася кіно. Подзвіг Кручкова быў адлюстраваны на мностве плакатаў і нават на карціне Рэпіна.

27 жніўня 1914 года (па новым стылі) у газеце «Віцебскі веснік» з'явіліся нататкі карэспандэнта пра наведванне Кручкова ў лазарэтным памяшканні жаночага духоўнага вучылішча (*цяпер — будынак Віцебскага аблвыканкама.* — **Аўт.**). «25 гадоў, стройны, тонкі, жылісты, шапка павойных цемнарусых фурманаў», — пісаў журналіст.

— Для падтрымання баявога духу падчас Першай сусветнай вайны патрабаваліся прыклады гераізму, і яны не прымусілі сябе доўга чакаць. 12 жніўня раз'езд з чатырох данскіх казакоў непадалёк ад польскага горада Кальварыя натрапіў на 27 нямецкіх драгунаў. У сутычцы, якая завязалася, праявіў небывалы гераізм 25-гадовы казак Казьма Фірсавіч Кручкоў (гады жыцця: 1890-1919), які засек і закалоў пікай 11 чалавек, а сам атрымаў 16 ран. У выніку агульных намаганняў казакоў, як потым пісалі ў справаздачы аб тым баі, «на зямлі ляжалі 23 трупы ды насіліся некалькі спалоханых коней». Аб гэтым подзвігу казака даведалася ўся Расія. Кручкоў стаў першым з пачатку вайны кавалерам салдацкага Георгіеўскага крыжа. Пачаўся час яго славы, — расказвае **Валерый ШЫШАНАЎ, намеснік па навуковай працы** дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

Іх афіцэр наскочыў — я адбіў яго напад і пагнаўся за ім. Ён — уцякаць. Я дагнаў, узмахнуў шашкай і кульнуў яго па галаве, толькі каска сагнулася.

А вось як пра свой подзвіг расказваў сам герой: «Мяне акружылі немцы — 11 чалавек. Не вельмі спадзеючыся застацца жывым, я вырашыў дорага прадаць сваё жыццё. Кабыла ў мяне рухомая, паслухмяная. Хацеў спачатку пусціць у ход вінтоўку, але спехам патрон «заскочыў». Схапіўся за шашку і пачаў працаваць. Атрымаў некалькі дробных ран. Адчуваю: кроў цячо... За кожную рану адказваю смяротным ударам... Іх афіцэр наскочыў — я адбіў яго напад і пагнаўся за ім. Ён — уцякаць. Я дагнаў, узмахнуў шашкай і кульнуў яго па галаве, толькі каска сагнулася. Я зноў узмахнуў. Мой удар прыйшоўся па шыі, і галава была амаль адрэзана. Паклаўшы некалькі чалавек, я адчуў, што шашкай цяжка працаваць. Схапіў піку і ёю па адным паклаў астатніх. У гэты час мае таварышы ліха справіліся з іншымі. Таварышы мае атрымалі лёгкія раны. Я таксама атрымаў 16 ран, але ўсё «пустых»: уколы ў спіну, шыю, рукі».

Спачатку геройскага казака хацелі адправіць на лячэнне ў Маскву, але вырашылі шпіталізаваць у Віцебску.

Пра тое, як яго сустрэлі ў губернскім Віцебску, як цёпла і ласкава клапаціліся, Кручкоў і яго таварышы гаварылі рэпарцёрам з асаблівай удзячнасцю: «Як нідзе! Шчыра просім напісаць, што ніколі не забудзем ласкі, клопатаў і догляду за намі тут. Ад усяго сэрца дзякуем усім, асабліва добрай начальніцы «Чырвонага крыжа» С.В. Арцымовіч і спадарыні начальніцы духоўнага вучылішча».

Пасля шпіталя Кручкоў, як раней, адважна ваяваў і атрымаў яшчэ два Георгіеўскія крыжы, два медалі і афіцэрскі чын. Пасля вяртання з фронту дамоў, на Дон, удзельнічаў у грамадзянскай вайне — на баку белых. Падчас бою з чырвонаармейцамі ён і загінуў. Было гэта ў жніўні 1919 года.

У эмігранцкім друку так апісвалі гэтую падзею: «Сотнік Кручкоў на чале варты казакоў самавольна, без загаду спрабаваў выбіць чырвоных (узвод пяхоты з кулямётам) з супрацьлеглага берага пад станіцай Астроўскай. Чырвоныя падпусцілі бліжэй і перабілі ўсіх з кулямёта».

Не абышлося без чутак. Народная пагалоска разнесла, што палоннага героя ці то застрэліў, ці то засек сам Будзённы. Але дакументальна гэта ніяк не пацвярджаецца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Плакат перыяду Першай сусветнай вайны, прысвечаны подзвігу К. Кручкова.

■ «Сакавітае» мастацтва

Прыгожа... Аж з'есці хочацца!

Месца, дзе кабачкі ператвараюцца ў хрызантэмы, радыска — у гваздзікі, цыбуля — у цюльпаны, перац — у ліліі, а кавун — у ажурны барэльеф, можна знайсці па... сакавітым водары. Завітаўшы ў Палац культуры ветэранаў у сталіцы, дзе днямі праходзіў чэмпіянат па карвінгу (мастацкая разьба па гародніне і садавіне), кожны мог у гэтым упэўніцца. Кветкі, карункі і арнаменты майстры карвінгу робяць з самых свежых «матэрыялаў»...

— Часцей за ўсё я раблю такія кампазіцыі для сямейнага святочнага стала, калі чакаецца прыход гасцей. Хочацца парадаваць усіх запрошаных чымсьці прыгожым, — распавядае адна з удзельніц спаборніцтваў Вольга Жывіца.

Карвінгам, дарэчы, называецца не толькі разьба па гародніне і садавіне, а яшчэ і па дрэве, камені і лёдзе. Для тых, каму найбольш блізкі менавіта «кулінарны» карвінг, варта ведаць некаторыя правілы: нельга браць прадукты, якія хутка цямнеюць, бо гэта сапсуе ўсю прыгажосць, не варта таксама аздабляць стравы дэкаратыўнымі элементамі, што не спалучаюцца з імі па смаку (напрыклад, ружачкі з памідораў на крэветках — не самы лепшы варыянт). Як давялося ўпэўніцца, кожны спрактыкаваны карвінгіст мае свае сакрэты: напрыклад, адна з удзельніц кідала гатовыя кветкі ў талерку з вадой, каб даўжэй выглядалі «бадзёрымі».

Майстрыхі і рады б расказаць больш, і нават навучыць, але журы прыспешвае, таму вакол адчуваецца ўсеагульнае хваляванне. Жаночыя рукі (мужчын сярод канкурсантаў не было) акуратна і спрытна рэжуць садавіну і гародніну спецыяльнымі нажамі. У некаторых выпадках пасля «творчага пераасэнсавання» той жа цыбулі цяжка зразумець, што кветка ці лісточак зроблены менавіта з яе. Майстрыхі, дарэчы, амаль усе займаюцца карвінгам у якасці хобі. Усяго некалькі ўдзельніц працуюць кухарамі і лічаць такі навык прафесійным. Астатнія (настаўнікі, кладаўшчыкі, слесары, лабаранты, медсёстры, прыбіральшчыцы) — па-за межамі конкурсу. Аб'ядноўвае іх уменне ствараць сапраўднае мастацтва з будзённых рэчаў.



Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

Даты | Падзеі | Людзі

Міжнародны дзень сельскіх жанчын. Абвешчаны на 62-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у адпаведнасці з рэзалюцыяй ад 18 снежня 2007 года.

1814 год — нарадзіўся Міхаіл Лермантаў. «Проза Лермантава — цуд. Яшчэ большы цуд, чым яго вершы», — захапляўся Леў Гумілёў. «Пушкін — дзённае, Лермантаў — начное святіла рускай паэзіі», — такое вызначэнне даваў Дзмітрый Мережкоўскі. А Ганна Ахматава ў артыкуле аб Лермантаве пісала: «Словы, сказаныя ім пра закаханасць, не маюць сабе роўных ні ў адной паэзіі свету. Гэта так проста, так нечакана і так бяздонна. Пушкін і Лермантаў — гэтыя два імёны зліліся ў нашай свядомасці са школьных гадоў. Але якія яны былі рознyя! У артыкуле « Рамяство паэта» Валерый Брусаў адзначаў, што Пушкін працаваў над вершамі, рабіў іх, а ў Лермантава вершы выходзілі з галавы ўжо гатовымі. Пушкін жадаў, каб чутка пра яго прайшла «па ўсёй Русі вялікай». Лермантаў жа задумваўся над тым, ці не лепш было б пакінуць свае мары назаўсёды ў глыбіні душы, бо няма ў мовы сіл, каб выказаць патаемныя думы — «вершам мерным і словам ледзяным не перадасі ты іх значэння».

1953 год — 60 гадоў на Мінскім трактарным заводзе выраблены першы колавы трактор «Беларус».

1953 год — нарадзіўся (г.п. Плешчаніцы Лагойскага раёна Мінскай вобласці) Мікалай Яфімавіч Сяменчык, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук. Даследуе гісторыю партый, прафесійных, нацыянальных арганізацый і рухаў падчас Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 года, перыяду акупацыі Беларусі германскімі і польскімі войскамі ў 1918-1920 гадах.

Было сказана

Браніслаў ТАРАШКЕВІЧ, пісьменнік, літаратуразнавец, публіцыст, вучоны-моваznавец:

«Сёння не быць сляпым — і на заўтра мець гатовую думку».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па геаграфіі: Альпы. Ева. Віцім. Шыя. Такса. Іра. Кар. Крок. Арка. Лато. Іра. Луара. Фарш. «Ленком». Ратуша. Зуб. Мат. Ліра. Карыда. Доза. Лнос. Нох. Серп. Акцыя. Вахш. Аўт. Тран. Карт. Фан. Абрыкос.

Па геаграфіі: Перык. Сліва. Док. Екон. Зло. Куліз. Гало. Бранявік. Чынш. Мара. Кай. Хватка. Сватар. Аўран. Арах. Лістар. Шык. Гта. Ван. Скала. Ксі. Яваг. Лаза. Онад. Рыс. Каракумы. Тар. Шайбер. Тло. Шпага. Парнас.

Віншуем з Днём нараджэння дырэктара ААТ «Агра-Зарэчча» Аляксандра Мікалаевіча **СІЛЬВАНОВІЧА,** які ўзначаліў наш працоўны калектыў у гэтым годзе. Жадаем Вам, шаноўны Аляксандр Мікалаевіч, як мага хутчэй замацавацца на новай і адказнай пасадзе, свой малады задор, ініцыятыву і працаздольнасць смялей спалучаць з вопытам старэйшых кіраўнікоў раёна. Верым, што агульнымі намаганнямі мы зможам набліжацца да іх узроўню ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці.

Адміністрацыя і камітэт прафсаюза ААТ «Агра-Зарэчча» Камянецкага раёна.

УНП 200056225

Паважанага **Ігара Іванавіча ЛОЙКУ**
з г/п Чырвоная Слабада Салігорскага раёна
віншуем з прыгожым мужчынскім юбілеем.

Няхай табе шчасціць у жыцці — будзь заўсёды здаровым, запатрабаваным, любімым мужам і бацькам. Святочнага настрою!

Твае сябры.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.37	18.12	10.35
Віцебск	7.29	18.00	10.31
Магілёў	7.28	18.02	10.34
Гомель	7.22	18.02	10.40
Гродна	7.52	18.28	10.36
Брэст	7.50	18.31	10.41

Месяц

Першая квадра 12 кастрычніка. Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Ганны, Усціны, Андрэя, Давыда, Канстанціна, Касьяна, Купрыяна.*
К. *Тэрэзы, Ядвігі, Леанарда.*

Фота Анатоля КІЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+10..+12°С	КІЕЎ	+12..+14°С	РЫГА	+5..+7°С
ВІЛЬНЮС	+7..+9°С	МАСКВА	+9..+11°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+4..+6°С

УСМІХНЕМСЯ

Чым менш жанчыну мы кахаем, тым горшы боршч, кашулі не папрасаваныя, шкарпэткі не мытыя і дзеці на цябе не вельмі падобныя.

У сталовай :
— А суп у вас ёсць?
— Ёсць адзін.
— Які?
— Гарохавы расольнік.
— Гэта ж два супы!
— Цяпер ужо адзін: нам каструля тэрмінова спатрэбілася.

Нецвярозы трактарыст павялічыў пасяўныя плошчы прыкладна на паўвёскі.

— Слухай, а чаго гэта танкісты котку на брані возяць?
— Ды яны прыбор начнога бачання зламалі!

carticatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.525. Індэкс 63850. Зак. № 4526.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 кастрычніка 2013 года.